Студэнцкая старонка ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Жыццё Максіма Бручко ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 50 (2639) Год LI | Беласток, 10 снежня 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

САБРАЦЬ РАСКІДАНУЮ ГІСТОРЫЮ

З Сяргеем ЧЫГРЫНЫМ са Слоніма, гутарыць Аляксандр Вярбіцкі.

— Якія былі пачаткі — з дзяцінства — Вашага зацікаўлення гісторыяй?

— Я рос у вёсцы. Мяне выхоўвала адна маці, якая з раніцы да вечара без выхадных дзён працавала паляводам у калгасе. А я хадзіў у вясковую школу, пасля школы адзін сядзеў дома, вучыў урокі, пісаў, думаў, а таксама, як і кожны вясковы хлапчук, дапамагаў маме па гаспадарцы. І мама мне не змагла даць тых ведаў, якія, напрыклад, давалі бацькі гарадскім дзецям. Але маці мяне навучыла шчырасці, дабру, цаніць сваё роднае і блізкае, паважаць людзей, родную мову і берагчы тое, што засталося нам у спадчыну ад дзядоў і прадзедаў. Мама мне дазваляла ўсё, бо ведала, што я нічога дрэннага ніколі не зраблю. Так яно і было. Са школы я зацікавіўся гісторыяй беларускага кіно. Мама, калі ездзіла ў Слонім, заўсёды мне купляла часопісы па кінамастацтве, пасля кнігі, паштоўкі — адным словам усё, што было звязана не толькі з беларускім, але савецкім і замежным кіно. Пасля я зацікавіўся тэатрам. Гэтае зацікаўленне прывяло мяне на тэатральнае аддзяленне Магілёўскай культасветвучэльні. Там былі выдатныя педагогі, найперш рэжысёры Леанід Багам'я і Валянцін Ермаловіч — родны брат гісторыка Міколы Ермаловіча. Мы ставілі спектаклі па п'есах беларускіх драматургаў, пісалі сцэнарыі, вершы, мініяцюры. Валянцін Ермаловіч пазнаёміў мяне з паэтам Аляксеем Пысіным, які надрукаваў мае першыя вершы ў „Магілёўскай праўдзе". А яшчэ тут я вырашыў, што хачу быць тэатральным крытыкам. Мяне накіроўвалі ў Маскву на вучобу, але я не паехаў. Я пайшоў у войска, пасля якога паступіў на філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Бо мне надакучыла расійская чужбіна (я служыў у Чыцінскай вобласці і ў Бурацыі), таму вельмі хацелася дамоў на Бацькаўшчыну. І я вярнуўся.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Сяргей Чыгрын — гісторык, краязнаўца, журналіст, паэт

— Дык якая добрая фея павяла Вас далей у айчыннае рэчышча гістарычнай стыхіі?

— У айчыннае рэчышча гістарычнай стыхіі мяне не павяла добрая фея, а прывёў універсітэт. Вось тут я сапраўды акунуўся ў літаратурную і гістарычную стыхію. А гэтымі „феямі" былі вядомыя літаратуразнаўцы і педагогі Вячаслаў Рагойша, Алег Лойка, Сцяпан Александровіч, Рыгор Семашкевіч, Ніл Гілевіч, Кузьма Хромчанка, а таксама аддзел рэдкай кнігі і беларускі аддзел Нацыянальнай бібліятэкі. Я так захапіўся гісторыяй літаратуры, столькі даведаўся цікавага, новага, невядомага раней, што ўсё гэта для мяне было як хлеб. Я пачаў збіраць па крупінцы ўсё, што можна было знайсці па гісторыі Беларусі, яе культуры, літаратуры. Я зачытваўся кнігамі Уладзіміра Пічэты, Уладзіміра Караткевіча, Аляксандры Бергман, Юры Туронка, Адама Мальдзіса, Генадзя Кісялёва, Сцяпана Александровіча, Арсеня Ліса, расійскіх і польскіх гісторыкаў. Пачаў пісаць і сам. Знайшоў дзесяткі іншых матэрыялаў, раней невядомых, звязаных з жыццём і дзейнасцю знакамітых беларусаў. Гэтыя пошукі працягваюцца і цяпер. І працягваюцца яны ўсюды, дзе толькі магчыма. І тымі рознымі спосабамі, якія можна толькі прымяніць у той сітуацыйна-палітычна-эканамічнай Беларусі, у якой мы апынуліся і жывём сёння.

— Як выглядаюць пошукі матэрыялаў: дзе скарбы айчыннай гісторыі — у раздольным полі, у цёмным лесе, у кашчэя каварнага, якому трэба рабіць уступкі? З якіх фондаў?

— Скарбы беларускай айчыннай гісторыі раскіданы па ўсім свеце. Беларусь — ці не адзіная дзяржава ў свеце, якую рабавалі стагоддзямі і рабуюць зараз. Беларускія скарбы, у тым ліку і літаратурныя, беларусам трэба шукаць не толькі ў Вільні, Санкт-Пецярбургу, Маскве, Львове, Празе, Варшаве, Кракаве, Гамбургу, Лондане, дзе іх сапраўды шмат, але і далёка на расійскім усходзе. Сотні, тысячы каштоўных дакументаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю знакамітых беларусаў знаходзяцца ў архівах і бібліятэках расійскіх гарадоў — у Томску, Омску, Разані, Казані, Новасібірску, Іркуцку, Камсамольску-на-Амуры, Варкуце, Краснаярску і ў іншых гарадах. Туды трэба ехаць беларускім даследчыкам, там нашы дакументы, пачынаючы з часоў Тадэвуша Касцюшкі і канчаючы „перастройкай". Рускіх людзей тыя дакументы не цікавяць. А нам яны вельмі патрэбныя, там наша гісторыя, там лёсы беларусаў. Там трэба шукаць і многія музейныя экспанаты, у тым ліку і крыж Еўфрасінні Полацкай. Толькі як туды паехаць, як туды трапіць? Дзяржава ў пошуках беларускіх дакументаў і скарбаў зусім не зацікаўлена. А працы ў беларускіх гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, краязнаўцаў і архівістаў вельмі шмат. Можа мы, беларусы, гэтым і шчаслівыя, што шукаць нам яшчэ і шукаць, пісаць і выдаваць мільёны кніг, сайтаў, дыскаў, альбомаў. Але трэба не забываць і тое, што з гадамі ўсё бясследна знікае.

— Як замацоўваюцца, куды ўкладваюцца сабраныя Вамі навуковыя плады?

— Навуковых пладоў сабрана многа. Але ў Беларусі сядзець за камп'ютэрам і пісаць кнігі немагчыма, бо трэба спяшацца на працу, а то і на дзве-тры, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю. Ды і ганарараў беларускія газеты і часопісы амаль не плацяць — няма грошай. Таму навуковыя сабраныя плады чакаюць свайго часу. Толькі ці наступіць гэты час? Вось у чым пытанне. Ды і кніжку выдаць таксама патрэбны грошы. А дзе іх браць? Таму выдаецца толькі тое, наколькі дазваляюць фінансы, якія таму ці іншаму аўтару ўдалося знайсці на сваё выданне. Я падрыхтаваў літаратурную спадчыну беларускіх пісьменнікаў Тодара Лебяды, Кандрата Лейкі, Янука Дарашкевіча і Уладыслава Чаржынскага (дарэчы, апошнія двое родам з Беласточчыны). Але хто мне іх дапаможа выдаць?.. Я гатоў сёння працаваць на які-небудзь фонд ці інстытут, пісаць для іх літаратурна-гістарычна-краязнаўчыя кнігі, калі яны будуць фінансаваць маю працу і я буду ўпэўнены, што кнігі пабачаць свет.

— Дзякую за размову і жадаю Вам дальназоркага спору ў вылаўліванні нашых гістарычных жамчужын і іх укладкі ў наша нацыянальнае калье.

Выбары ... ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

— Добры вечар! Я з ініцыятыўнай групы прэтэндэнта ў кандыдаты, які мае намер балатавацца па вашай выбарчай акрузе на маючых адбыцца выбарах у мясцовыя саветы, — прыкладна так пачынае размову зборшчык подпісаў, пасля таго, як яму адчынілі дзверы ў кватэру незнаёмыя дагэтуль людзі.

На Беларусі праходзіць чарговая выбарчая кампанія. Чатырнаццатага студзеня людзі прыйдуць на выбарчыя ўчасткі і ўкінуць у скрынкі для галасавання бюлетэні з пазначаным прозвішчам свайго абранніка...

Жыць у Скупаве ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Жыхары Скупава жывуць мінулым свайго сяла, пра якое ўспамінаюць у час размоў. Сённяшняя пусцеючая вёска пасумнела. Мае суразмоўцы паказваюць на пустыя дамы і кажуць, што цяпер жыхары сяла, сярод якіх найбольш пенсіянераў, больш заняты сваімі прыватнымі справамі і менш ахвотныя на супольныя сустрэчы і бяседы. Земляробы, якіх ужо ў вёсцы мала, апрацоўваюць яшчэ вялікую частку вясковых палёў. Астатняя зямля ляжыць аблагом і ў чаканні новых аматараў гаспадарання паволі пачынае самааблясяцца...

Чаму па-руску? ☞ 9

(раст)

Першы раз пасля некалькіх гадоў у мінулы уік-энд на падмостках беластоцкага Тэатра імя Аляксандра Вянгеркі выступіў Драматычны тэатр з Гродна. Гэта пачатак узноўленага супрацоўніцтва абодвух драмтэатраў. Гродзенцы паказалі пастаноўку „Рок-концерт с Григорием Гориным"...

Папраўка

У тэкст „Выбары: Бельск — Гайнаўка", н-р 49 „Нівы" трапіла памылка. Я перабольшыла лік галасоў, аддадзеных на Яўгена Сачко ў гайнаўскую Гарадскую раду. У сапраўднасці аддалі на яго свой голас 203 выбаршчыкі.

Раіна СТЭФАНЧУК

Словы спачування

Спадару
Яраславу Іванюку
і ягоным родным з прычыны
напаткаўшага яго гора
— смерці мамы
Ніны

выказвае рэдакцыйны калектыў і Праграмная рада тыднёвіка „Ніва"

9 770546 196000

Выбары без выбаршчыка

— Добры вечар! Я з ініцыятыўнай групы прэтэндэнта ў кандыдаты, які мае намер балатавацца па вашай выбарчай акрузе на маючых адбыцца выбарах у мясцовыя саветы, — прыкладна так пачынае размову зборшчык подпісаў, пасля таго, як яму адчынілі дзверы ў кватэру незнаёмыя дагэтуль людзі.

На Беларусі праходзіць чарговая выбарчая кампанія. Чатырнаццатага студзеня людзі прыйдуць на выбарчыя ўчасткі і ўкінуць у скрынкі для галасавання бюлетэні з пазначаным прозвішчам свайго абранніка. А пакуль што ідзе збор подпісаў, каб можна было патрапіць у той бюлетэнь.

Дзверы адчыняюць пераважна жанчыны. Часамі дзеці. Але калі зборшчык подпісаў просіць іх паклікаць каго-небудзь з дарослых, дзеці часцей за ўсё клічуць маці. Людзі на просьбу сябра ініцыятыўнай групы паставіць свой аўтограф у падпісным лісце рэагуюць па-рознаму. Калі гаспадары кватэры запрашаюць зайсці ў хату, то подпіс амаль што на паперы. Застаецца адказаць на некалькі простых пытанняў і гаспадары гатовыя падпісацца. Некаторыя нават нічога не пытаюцца. Праўда, як даходзіць да таго, што трэба перапісаць пашпартныя даныя, некаторыя трошкі пачынаюць сумнявацца ці не наклічуць яны на сябе сваім учынкам чаго нядобрага. Але ўжо неяк няёмка адмовіць зборшчыку пасля паабяцанага.

Менш за ўсё людзей цікавіць партыйнасць прэтэндэнта ў кандыдаты. Прынамсі рэдка хто з іх сам пачынае пытацца пра гэта. Больш за ўсё ім хочацца ведаць дзе працуе гэты чалавек. А пра такія рэчы як нацыянальнасць, веравызнанне або сямейнае становішча ўвогуле ніхто не пытае. Але калі зборшчык сам распавядзе, што збірае подпісы за добрага сем'яніна, бацьку некалькіх дзяцей, то жанчыны ставяць подпіс з задавальненнем. На мужчын падобная рэклама дзейнічае менш.

Большасць людзей не адмаўляе ў подпісе. Перш за ўсё таму, што іх пра гэта папрасілі, і ім неяк няёмка адмовіць. І ўсё. Ніякіх наказаў будучаму кандыдату бальшыня не дае. Толькі калі той сам збірае подпісы за сябе, тады жыхары з ахвотай распавядаюць яму пра свае праблемы. Але спадзяванні, што той дапаможа іх вырашыць, вельмі малыя.

А вось адмаўляюць у сваім подпісе па розных прычынах. Адны кажуць, што не хочуць мець праблемаў. Раптам падпішуцца не за таго, за каго трэба. Якія гэта праблемы — ніхто не ведае. І ніколі іх не мелі. Але на ўсялякі выпадак рызыкаваць не збіраюцца. Гэта ў асноўным мужчыны. Некаторыя проста лянуюцца пашукаць пашпарт. Іншыя сцвярджаюць, што не збіраюцца ўдзельнічаць у бессэнсоўнай справе. Маўляў, ад іх выбару ўсё адно нічога не зменіцца. Такіх, хто не падпісваецца па нейкіх палітычных або ідэалагічных поглядах практычна няма. І поглядаў, хіба што, таксама.

Жорсткае супрацьстаянне прэтэндэнтаў у кандыдаты ад улады і іх „калегаў" ад апазіцыі ў кватэры звычайных грамадзян не прыйшло. Збольшага, ім усё роўна хто ты, і якіх ты палітычных поглядаў, і на якой размаўляеш мове, і за Лукашэнку ты ці супраць яго. Самае дзіўнае, што прайшло толькі паўгода пасля вельмі бурных прэзідэнцкіх выбараў, а мала хто пытае пра тое, чым займаюцца зараз былыя кандыдаты на прэзідэнцкую пасаду, як склаўся іх лёс, ці збіраюцца яны далей змагацца за вышэйшы дзяржаўны пост. Не пытаюцца і пра тое, што плануе апазіцыя, якія яе намеры, чаго чакаць у будучым. Увогуле ні пра што не пытаюцца. Складваецца такое ўражанне, што выбары будуць праходзіць у іншай краіне, а не ў нас. А нам толькі трэба распісацца ў падпісным лісце, калі нехта папросіць, а пасля схадзіць прагаласаваць. А хто пераможа і так зразумела. Той хто трэба, той і пераможа. Каму трэба, каб перамог той хто трэба, таксама застаецца як бы не вызначаным. Нібыта гэта трэба не нам, а зноў жа некаму, каго мы не ведаем і ведаць не будзем. І нават атрымаўшы за сябе подпіс, чуеш ад добразычлівых і чулых нашых людзей сардэчнае „Да пабачэння", а не „Жадаю перамогі". А часамі, калі прэтэндэнт у кандыдаты вельмі падрабязна растлумачыў, што ідзе на выбары каб паспрабаваць палепшыць жыццё звычайных людзей, яму могуць задаць цікавае філасофскае пытанне: „А навошта вам гэта трэба?"

Віктар САЗОНАЎ

Моц паперы

Калісь-калісь марылася мне пазнаванне шырокага свету. Пазней той летуценны буй усё больш затрачваў свой радыус і ўжо нават у ГДР я не з'ездзіў. У тым часе захацелася мне і мовы шырокамаштабныя пазнаць, дзеля чаго купіў я быў некалькі самавучыцеляў, але і тут запал мой пайшоў на спад, асталіся толькі падручнікі...

На працягу апошняга года замежныя заходнія мовы самі закруціліся каля мяне, як тая гара каля Магамета. І то так, што нават у адзін момант пачуўся я чужым у сваёй кватэры. Давай я цягнуцца за духам часу: выцягнуў старыя самавучыцелі англійскай мовы і воляй-няволяй стаў з імі дужацца. А яны ў мяне з дзвюх крыніц: гэта рэпрынты англійскіх падручнікаў для замежнікаў ды савецкія „учебники". Розніца паміж гэтымі кнігамі вельмі істотная: англійскія знаёмяць з мовай паўсядзённых радасцей і клопатаў рознамаёмаснага звычайнага чалавека. Савецкія ж падручнікі здамінаваны ідэалогіяй і геапалітыкай. Нібы вучань вывучае мову, але перш за ўсё атрымоўвае індактрынацыйную спажыву пра г.зв. змаганне савецкага народа за ўсеагульнае шчасце чалавецтва; вядома — супраць заўзятых ворагаў гэтага шчасця... Можна паставіць пытанне: а чаму ж я для вывучэння заходняй мовы абзавёўся савецкімі кнігамі? Зрабіў я гэта таму, што яны былі вельмі танныя; нізкая — дэмпінгавая — цана савецкіх кніжак, якія выпускаліся толькі пасля індактрынацыйнага дабра цэнзуры, заманьвала чытачоў у той жа індактрынацыйны капкан. Гэтакім чынам гістарычны ўжо Савецкі Саюз працягвае паціху даплачваць да маёй цяперашняй моўнай адукацыі...

Чытаю ў 45-м н-ры „Нівы" тэкст Васіля Сакоўскага „І зноў перастройка". Аўтар высока ўзнімае сцяг Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай Рэвалюцыі. Зважаючы на гэтую эпахальную падзею, заходнія капіталісты, „каб не дапусціць рэвалюцыі ў сябе, яны пачалі ад страху ісці свайму рабочаму класу на ўступкі: скарачалі працоўны дзень, лепей аплачвалі працу, дазвалялі рабочым арганізаваць прафсаюзы, узаконьвалі іншыя выгады і льготы" — піша ён. Спадар Сакоўскі гэта ўсё добра ведае, бо ж ён гэтыя дзеянні бачыў увачавідкі. Ён гэта ўвачавідкі бачыў на паперы: у савецкіх падручніках, „правдах", „известиях", „трудах" ды іншых „собранных сочинениях". Напрыклад, мой савецкі энцыклапедычны даведнік аповед пра сацыяльнае страхаванне пачынае з Савецкага Саюза, згадваючы на канцы, што такое ёсць і ў буржуазных краінах — вельмі так напісаў і спадар Сакоўскі. Аб прафсаюзах цэнзура праваронила два сказы ў пачатку: „В странах Зап. Европы П. с. стали создаваться с кон. 18 в. В России возникли в ходе революции 1905-07"; далей пра прафсаюзы амаль так, як і ў спадара Сакоўскага.

Польская, яшчэ „сацыялістычная", чатырохтомная „Encyklopedia Powszechna PWN" вытокі задумы сацыяльнага страхавання датуе на 16-18 стст. Абавязковае сацыяльнае страхаванне было ўведзена ў Германіі Бісмаркам у 1883-89 гг. „Жалезны канцлер" скараціў таксама рабочы дзень. А савецкі даведнік піша толькі, што Бісмарк „пытался подавить герм. рабочее движение". У той час завяршаецца выпуск Марксавага „Капіталу" за грошы буржуйскага Энгельса. У той жа больш-менш час, у другой палове 19 ст., у буржуазных краінах прафсаюзы сталі суб'ектамі грамадскага жыцця. І ў той жа больш-менш самы час вялікія кастрычніцкія рэвалюцыянеры бегалі яшчэ ў кароткіх нагавічках.

Гэты тэкст пішу, аднак, не ў дыдактычных мэтах, не каб вучыць настаўніка. Хачу тут толькі паказаць моц паперы, якой між усіх іншых пакорны і я. Вось нядаўна адбыліся самаўрадавыя выбары, грамадскае спаборніцтва, у якім, нягледзячы на наступ электроннага віртуальнага свету, папера ўсё яшчэ не здае сваіх пазіцый. Для прыкладу вазьму забег Беларускага выбарчага камітэта ў Беластоку. Калі б я быў стороннім назіральнікам, я б яго старту і не заўважыў. Не глядзеў я перадвыбарчых агітак у тэлебачанні; яны ў мяне маюць ужо так выразную цану. Але ўсе паперы, што былі ў паштовых скрынках, аглядаў. І па вуліцах Беластока хадзіў, а вачэй у той час заплюшчваць не мог. І з тумбаў, табло, банэраў усміхаліся да мяне прымільна розныя папяровыя добранькія ягамосці. Сказаць можна, што зачыняў я перад імі дзверы, электронныя, а яны лезлі праз вокны, папяровыя! Не паказаліся мне толькі тыя, якіх хацелася б мне пабачыць. Ніадкуль не глянулі мае ні спадар Стахвюк, ні спадарыня Лаеўская, ні спадар Петрук... Папера ўсё яшчэ стварае непапяровыя факты.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Доўгая дарога перад намі

Уважліва прыглядаўся я апошнім часам візіту папы Бенядзікта XVI у Турцыю. Маю ўвагу перш за ўсё прыцягнула ягоная сустрэча з патрыярхам Канстанцінопаля Варфаламеем I. Самае цікавае, што ў польскіх электронных СМІ найбольш месца гэтай падзеі, калі я не памыляюся, адвяло тэлебачанне „Trwam" айца Тадэвуша Рыдзыка.

Мне пры гэтай нагодзе прыпомніўся васьмігадовай даўнасці візіт Варфаламея I на Беласточчыну, асабліва ў Супрасльскі манастыр. Вялікіх тлумаў вернікаў не было. З паставы і слоў патрыярха выпраменьваліся незвычайнае цяпло, дабрыня. Адчувалася любоў да кожнага, у тым ліку да дзяцей; адно з іх у храме, пры ўсхваляванні вернікаў, патрыярах узяў на рукі і прутыліў. Гэтаксама рабіў папа Ян Павел II, ці, можа, наадварот.

У справаздачах і каментарыях пасля апошняга спаткання Бенядзікта XVI з Варфаламеем I можна было адчуць, што можа дзякуючы якраз гэтаму прыйдзе пераломны момант у ненайлепшых кантактах паміж Каталіцкім касцёлам і Праваслаўнай царквой. Некаторыя СМІ за такое міжканфесійнае становішча вінавацілі Яна Паўла II. Я спрабаваў прыпомніць, як было. І прыгадалася мне дэкларацыя, падпісаная ў Ватыкане абодвума іерархамі. Сталася гэта пасля спыненага ў 2000 г. экуменічнага дыялогу ў рамках праваслаўна-каталіцкай супольнай камісіі. Дарэчы, узнаўленне дыялогу ў той час папа і патрыярх палічылі „сваім даўгом". У самім тэксце дэкларацыі Ян Павел II і Варфаламей I падкрэслілі, што адносіны паміж абодвума цэрквамі ўскладніліся пасля развалу Савецкага Саюза, чаго вынікам стала адраджэнне цэркваў у краінах былога сацыялістычнага лагера. У той час абодва іерархі дыскутавалі над магчымымі вырашэннямі спрэчак, якія перашкаджалі ў экуменічным дыялогу. Ужо тады, у час свайго другога візіту ў Рым, Варфаламей I запрасіў папу наведаць Стамбул і цэнтр Канстанцінопальскага патрыярхату. У той час (але і раней, а таксама пазней) сусветныя агенцтвы так пісалі аб Варфаламеі I: „Яго характэрнай рысай з'яўляецца вялікае адданне ідэі экуменізму". Прыводзілі яны выказванні патрыярха: „Выступаючы перад адной аўдыторыяй сказаў ён: «Кожны, хто выступае супраць мэты поўнага хрысціянскага адзінства, выступае супраць волі Самога Бога»". І далей спасылаліся на ягоныя словы: „Як кажа яго свяцейства Ян Павел II, мы павінны быць адзінствам ужо цяпер, калі стаім на парозе трэцяга тысячагоддзя. Хоць гэта доўгая дарога, усё перад намі, абодва бакі рашылі ісці ўперад".

Тым часам да візіту Бенядзікта XVI у Турцыю першаіерарх расійскай Праваслаўнай царквы нанова выключыў візіт папы ў Маскву. У размове з парыжскай газетай „Paris Match" падкрэсліў, аднак, што ягоная сустрэча з папам магчымая, але „мы заўсёды адзначалі, што такое спатканне павінна адкрыць новыя бакі ў нашых стасунках і не павінна быць выключна пратакольным высілкам перад тэлекамерамі, з мэтай паказаць, што ў нас няма праблем, у той час калі яны ёсць".

Калі я прыгадаў гэтыя факты і калі працягваліся справаздачы з сустрэч Бенядзікта XVI з Варфаламеем I, у адным з беластоцкіх аўтобусаў я пачуў дыялог дзвюх немаладых жанчын:

— То дзе наш папа цяпер: у Стамбуле, ці ў Канстанцінопалі?

— Ну, а хто там у той іхняй Царкве найважнейшы: той Варфаламей, ці той з Масквы?

— Ну, вось, хто там кіруе іхнім Касцёлам?

Здаецца, яшчэ вельмі далёкая дарога да экуменіі. Без узаемнага азнаямлення, на пачатак, мала што атрымаецца.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

СТУДЭНЦКАЯ СТАРОНКА

Басаўскія гульні

Кожны па-свойму святкуе і перажывае важныя моманты. Бывае, аднак, што нават дзень нараджэння ці Вялікдзень не абазначае чагосьці

незвычайнага. Бываюць, аднак, хвіліны, якіх стараемся не забываць, паколькі рашалі яны аб лёсах некаторых з нас, амаль вызначалі нам будучыню. Думаю пра заснаванне Беларускага аб'яднання студэнтаў. Існуе група людзей, якая на большую частку жыцця звязалася з беларускім асяроддзем, ёсць таксама людзі, якія добра разумеюць значэнне БАСу для беларускага руху ў Польшчы. І вось менавіта гэтыя людзі вырашылі адзначыць угодкі 25-годдзя заснавання сваёй арганізацыі. Каму яна цяпер прыналежыць? Ці прыналежыць? Мо мы проста яе прыналежны? Цяжка акрэсліць стаўленне людзей да арганізацыі, асабліва ў момант, калі яна пачынае жыць сваім жыццём і, здаецца, не патрабуе чалавека...

Я веру ў людзей. З таго пачынаецца супольнае жыццё і такая ж дзейнасць. Думаю, каб не было веры ў паспяховасць БАСу ў 1981 годзе, маладыя беларусы не пачалі б сваёй барацьбы за тоеснасць сваю і беларускай студэнцкай арганізацыі. Напэўна патрэбна была падтрымка з боку аўтарытэтных людзей, паколькі моладзь патрабуе ўзораў. З перспектывы часу выглядае гэта даволі прыемна, ёсць мэта, спосаб і дзеянне, такая краіна шчаслівых падзей. Вядома, аднак, што ўмовы мяняюцца, жыццё нясе розныя сітуацыі, а і студэнты канчаюць установы. Людзі проста праходзяць. Мы таксама пройдзем, але пакуль выпала нам роля адсвяткаваць нашы ўгодкі. Не толькі так, каб адбыліся, але перш за ўсё так, каб сустрэць тых, якіх нам не прыйшлося ніколі пабачыць, а з'яўляюцца яны важнымі асобамі ў гісторыі БАСу. Няма чаго тут плакаць, што цяжкія часы не дазваляюць нармальна дзейнічаць. Фактычна, няма

і чым зашмат радавацца. Але калі спрабуем, часам нам нават удасца. Святкаванне планавалася даволі шырокамаштабнае. На працягу тыдня мела адбыцца прынамсі пара цікавых мерапрыемстваў, так у Беластоку, як і ў Варшаве.

Пачатак меў месца ў сталіцы, у час Беларускага андэрграўнду, два дні сустрэч з польска-беларускім музычным асяроддзем у розных галінах творчасці. Мерапрыемства атрымалася цікавае, прыцягнула шмат слухачоў. Пасля гэтага рыхтаваліся мы да культурнай актыўнасці ў Беластоку. Усе мы вельмі старанна настройваліся да свята, а тут усіх знянацку захапіла жалоба... Здавалася, усё пойдзе паспяхова. Павесілі мы здымкі ў клубе „Кабарэт", адкрылі выстаўку, пражылі юбілейны канцэрт у клубе „Гвінт", рыхтаваліся ўжо да атрасінаў і вялікага канцэрта на запусты, калі ўся Польшча даведалася пра трагічнае здарэнне ў шахце на поўдні краіны. Здавалася б так далёка, аднак аказваецца, што і мы адчулі шматзначны ўплыў сітуацыі. Што рабіць? Здавалася рашэнне амаль палітычнае, не скажу што лёгкае, з аднаго боку час падрыхтоўкі, грошы, якія пайшлі ўжо на

арганізацыю, з другога — грамадская думка беластоцкіх каталікоў, польскіх праваслаўных і ўсіх непрыхільных, завялікая адказнасць... Трэба было адклікаць... Жаль, асабліва таму, што якраз у суботу прывітала нас так прыгожае сонца, што хацелася дыхаць святлом. Цёпла, прыемна, ідэальна, тым больш, што на наступны дзень амаль на тыдзень павісла густая імгла. Разглядаць надвор'е, аднак, не галоўная мая мэта, вярнуся тады да святкавання. Самы важны момант меў месца ў пятніцу, 24 лістапада. Цяжка было адгадаць колькі людзей паявіцца на сустрэчы басаўцаў у Фальварку Надаўкі, што каля Беластока. Людзі званілі, пацвярджалі, ставіліся да ідэі сапраўды прыхільна і таму была надзея, што зала на 80 асоб запоўніцца. Жалоба давяля да таго, што частка людзей,

з якімі размаўлялі мы раней, не даехала, затое прыехалі іншыя. Цудоўныя неспадзяванкі, такіх момантаў варта чакаць. Якасць і вартасць размоў, дыскусіі, сувязь між людзьмі перакладаліся на характар самой сустрэчы як агульначаканай падзеі. Не было ў гэтым памылкі. Можа шкада толькі, што стварыліся такія ўмовы, што мала было часу, каб паведаміць больш сябраў БАСу. Галоўнай мэтай была сустрэча, самая простая рэч, але як жа ж важная ў жыцці. Людзі сустракаюцца, разыходзяцца, але да гэтых імгненняў часта вяртаюцца ў думках, гэта тое, што застаецца. Гісторыя БАСу гэта аповесць пра сутыкненні людзей, пра моманты, якія аб'ядналіся ў ланцуг здарэнняў. Не хочам, каб гэта быў ланцужок з крыжыкам, які лёгка сарваць. Цяжкая праца — гэта паняцце, ад якога добра трымацца на дыстанцыі, і да якога трэба ставіцца з пашанай. Для моладзі гэта даволі складаная справа, асабліва калі праца заключаецца ў выкарыстанні магчымасцей сваіх мазгоў. БАС гэта не проста арганізацыя, гэта асаблівая з'ява, гэта гульні і драматычны тэатр.

Басаўка/ілё
фота Міры ЛУКШЫ

зямля дарагая...

„Падарожжа, але не кожны... сутыкненьне", „там па дарозе...", „дарогай..." ідуць, бягуць, падарожнічаюць, прыходзяць, адыходзяць, прыедуць, ад'едуць... і мы шмат прайшлі. Хто возьме ўдзел у конкурсе і адкажа на пытанні: колькі паўстала рэйдаў беларускай моладзі і студэнцтва, колькі выпускаў гэтых жа рэйдаў адбылося, колькі кіламетраў прайшлі? Знайсці адказ на гэтыя пытанні гэта так быццам ведаць амаль усё пра нашу моладзь. Пешыя вандроўкі гэта адна з важнейшых традыцый беларускага маладзёжнага руху. Былі розныя людзі, розныя імпульсы, розныя шляхі, розныя месцы. Немагчыма пералічыць усіх, лік людзей, якія вандравалі, вялікі. Бывалі рэйды, у якіх удзельнічала пара дзесяткаў маладых людзей, былі таксама вандроўкі, у якіх ішло двух рашучых студэнтаў. Начавалі яны ў клунях, палатках, на траве, пад адкрытым небам, сустракалі сотні вясковых крамаў, дзе завязвалі незвычайныя кантакты, пазнавалі мясцовыя гісторыі. Наведалі яны дзесяткі цэркваў, хат, вучыліся гаварыць па-тутэйшаму, вывучалі сябе, пазнавалі Падляшша, пазнавалі адзін аднаго. І ў гэтым завяршаецца сэнс вандроўкі — каб пазнаць свае магчымасці, сваю гісторыю, іншага чалавека.

„Фортэ” дае працу

Мэблевая фабрыка „Фортэ” ў Гайнаўцы прымае на працу спецыялістаў і некваліфікаваных рабочых, якія хочуць здабыць прафесію. Прымае таксама жанчын. Гэта зараз вельмі важна.

Цяпер у гайнаўскім „Фортэ” працуе 550 чалавек. Фабрыка выпускае высакаякасную мэблю, якая трапляе на айчынны рынак і экспартуецца ў Германію, Аўстрыю і Англію. Яна карыстаецца зацікаўленнем пакупнікоў на еўрапейскіх рынках.

Зараз гайнаўскай фабрыцы вельмі патрэбны тэхнолагі драўніны — сама менш дзесяць гэтага роду спецыялістаў. „Фортэ” гарантуе ім атракцыйныя зарплаты і кватэры на кошт прадпрыемства.

Дырэктар фабрыкі Рышард Сабаст’ян вядзе перагаворы з рэктарам Беластоцкага політэхнічнага інстытута з мэтай адкрыцця факультэта тэхналогіі драўніны на базе гэтай навуковай установы ў Гайнаўцы. Выпускнікі тэхналагічнага факультэта мелі б працу ў „Фортэ”.

Абочыны ў хмызняку

Ёсць такая павятовая асфальтавая дарога са Старога Ляўкова ў Сушчу. Бяжыць яна цераз мост на рацэ Нарве, якая з’яўляецца граніцай паміж Нараўчанскай і Міхалоўскай гмінамі. Абочыны артэрыі — гэта амаль суцэльная сцяна кустоўя і прыдарожных дрэў. Сям-там кусты „выйшлі” з абочын да самай маставой. Дарога вузкая і з-за таго яшчэ больш небяспечная.

На сесіях нараўчанскай Гміннай рады жыхар Ляўкова выносіў прапанову, каб высечы кусты пры тракце дзеля добрай бачнасці і бяспекі.

На адной з апошніх сесій у Нараўцы быў кіраўнік Павятовага праўлення дарог у Гайнаўцы Тадэвуш Станкевіч і абяцаў, што прыдарожны хмызняк высекуць да канца кастрычніка 2006 года. Ужо снежань, а за добраўпарадкаванне шляху ніхто не бярэцца. Кустоўе як расло, так і расце. Ці кіраўнік ППД стрымае дадзенае слова?

Сустрэчы людзей трэцяга веку

У гэтыя доўгія асеннія вечары пачаў сваю дзейнасць Клуб асоб залатой восені ў Міхалове (Беластоцкі павет). Працуе ён пад патранатам войта Міхалоўскай гміны.

Сустрэчы адбываюцца ў Гмінным асяродку культуры ў Міхалове ў кожны чацвер вечарам ад гадзіны 17 да 20. Ад гадз. 17 да 18 вядуцца музычныя заняткі (м.інш. супольны спеў), а ад гадз. 18 да 20 — пластычныя (жанчыны займаюцца м.інш. ручной вышыўкай, вяжуць пруткамі). Сустрэчы карыстаюцца вялікім зацікаўленнем людзей т.зв. трэцяга веку. У ГОКу пенсіянеры адчуваюць сябе вельмі добра, прыемна праводзяць свабодны час.

(мох)

Жывуць мінулым сяла

Жыхары Скупава жывуць мінулым свайго сяла, пра якое ўспамінаюць у час размоў. Сённяшняя пусцеючая вёска пасумнела. Мае суразмоўцы паказваюць на пустыя дамы і кажуць, што цяпер жыхары сяла, сярод якіх найбольш пенсіянераў, больш заняты сваімі прыватнымі справамі і менш ахвотныя на супольныя сустрэчы і бяседы. Земляробы, якіх ужо ў вёсцы мала, апрацоўваюць яшчэ вялікую частку вясковых палёў. Астатняя зямля ляжыць аблагом і ў чаканні новых аматараў гаспадарання паволі пачынае самаабляцца. Будова побач сяла велізарнага авіяцыйнага радара мела паскорыць інвестыцыі ў вёсцы і таму людзі не пратэставалі супраць яго размяшчэння. Калі аказалася, што вонкавых сродкаў не хапіла, каб дакончыць асфальтаванне дарогі ў Скупаве, жыхары пачалі выказваць незадавальненне рашэннямі чыноўнікаў, якія дазволілі пабудаваць радар побач вёскі, што можа мець шкоднае ўздзеянне на здароўе. Асцярожна глядзяць на гэтую справу таксама новыя пасяленцы з Гданьска ці Беластока, якія прыязджаюць у Скупава на часовае жыхарства ў купленыя імі хаткі.

Калі я заехаў у Скупава, у вёсцы было пуста. Холад і даволі моцны вецер не спрыялі выходзіць на лавачку. Толькі побач вясковага магазіна сустрэў я двух мужчын. Адзін з іх запрапанаваў пагаварыць аб вясковых справах з яго мамай. Нягледзячы на холад сядзела яна з мужам на лавачцы, прытуліўшыся да высокага плота.

— Жывём мы насупраць, але з гэтага боку зацішней. Плот нядаўна паставілі жыхары Беластока, якія купілі гэты панадворак, — Марыя Такарук паказвае рукой на панадворак са старэнькай хаткай. — Абгарадзіліся новыя гаспадары, прывезлі гравій, пэўна будуць нешта будаваць.

Побач раскінуліся старыя хаткі і толькі далей красуецца вялікі мураваны дом.

— Вакол многа дамоў пустуе. Старыя паўміралі, а іх нашчадкі жывуць у гарадах, — гаворыць Ян Такарук.

Мае суразмоўцы ахвотна ўспамінаюць свае поспехі ў малочнай вытворчасці.

— Я гадаваў чатыры каровы. У нас на панадворку вялася скупка малака, а мая жонка яго прымала, — заяўляе Ян Такарук. — Нашы сяляне ў мінулым гадавалі многа кароў і прадавалі шмат малака. Пазней колькасць малака стала хутка абмяжоўвацца і скупка была спынена. Гаспадарам прыйшлося вазіць малако ў Нараўку. Тады сталі прадаваць кароў.

Пазней частка лугоў стала зарастаць кустамі, а палі пераўтварацца ў аблагі. Частка палёў стала аблясяцца.

— У вёсцы ёсць яшчэ конік і пару каровак. Некалькі гаспадароў займаецца расліннай вытворчасцю, — расказвае спадар Такарук. — Некаторыя пенсіянеры купляюць малако ў тых, што гадуюць яшчэ па кароўцы. Я, напрыклад, збяру яблыкі і памяняю іх на малако.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ян Такарук (злева), жонка Марыя Такарук і іх сын Ян успамінаюць мінулае

Абабіты дошкамі драўляны будынак, у якім прымалі малако, зараз нішчэе. Прыбітая да яго скрынка на лісты сведчыць, што ён яшчэ прыдатны Польскай пошце.

— Сена мы сушылі на лясной паляне ажно за Будамі. Доўга трэба было дабірацца на нашы лугі, а пасля трэба было выносіць траву з мокрых месцаў, каб яе высушыць. Было ў нас восем гектараў зямлі. Цяжка мы працавалі, а пасля ўсё поле аддалі дзяржаве, — гаворыць Ян Такарук.

Чарговага майго суразмоўцу таксама сустракаю на вуліцы. Выйшаў ён з хаты, каб падмясці лісце. Мікола Бірыцкі жыве адзінока і яму самому прыходзіцца сачыць за парадкам. Каб не сумаваць, гадуе пяць катоў і двое сабак.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У Скупаве найбольш драўляных дамоў, сярод якіх ёсць старэнькія хаткі

— Я многа гадоў працаваў будаўніком, да выхаду на пенсію, — кажа Мікола Бірыцкі. Успамінае ён буйнейшага гаспадара, які гадуе яшчэ 6 або 7 кароў, механізаваў сваю прадукцыю, а малако возіць прадаваць ажно ў Нараўку.

Солтыс, які жыве насупраць Міколы Бірыцкага, выйшаў з дому афармляць нейкія справы. Яго маці, якая яшчэ дапамагае сыну ў гаспадарцы і ў асноўным займаецца хатнімі заняткамі, запрашае мяне на размову.

— Ёсць у вёсцы магазін, апрача таго аўтакрамы падвозяць харчаванне ажно пад панадворак, — Надзея Дрозд асаблівую ўвагу звяртае на справы харчавання, бо ў час ваеннага ліхалецця жыхарам сяла прыходзілася галадаць. Хвалюецца яна за свайго сына Аляксандра, які шмат гадоў працаваў у гміннай управе, пасля ў страхавой фірме і на канец астаўся без работы.

— Цяпер сын наглядае за радарам і выконвае абавязкі солтыса, — тлумачыць спадарыня Надзея.

Старэйшая жанчына сумуе, што паменшаў прыбытак ад сельскагаспадарчай прадукцыі.

— Пад лесам, дзе мы абрабляем поле, на палях пачаў ужо расці лес. Ёсць там ужо маладыя бярозкі, — расказвае Надзея Дрозд. — З пушчы выходзяць алені і дзікі. У гэтым годзе з’елі нашу бульбу. Зямля ў нас слабая, прыбытак ад расліннай вытворчасці невялікі. Ужо раней маладыя паўцякалі ў гарады, толькі старыя тут дажываюць свой век. Сталі жыць у нас людзі з Гданьска, хваляць чыстае паветра і лес, у якім збіраюць грыбы і ягады.

Спадарыня Надзея прапануе падысці бліжэй радара, бо інвестыцыяй цікавяцца прыезджыя.

— Многа грошай каштавала будова радара і вялікія спецыялісты прыязджалі сюды. Апошнім часам перасталі свяціцца лямпачкі на радары, хіба цяпер ён не працуе, — кажа Васіль Казёл, мой чарговы суразмоўца. — За нашу згоду на будову радара ў большай частцы сяла паклалі асфальт. Войт абяцаў, што неўзабаве дакончаць асфальтаванне. З гэтага часу мінула з пяць гадоў, а ў нашым канцы вёскі надалей няма асфальту.

Нядаўна мадэрнізавалі дарогу, распаложаную паміж шашой Гайнаўка — Нараўка і вёскай. Пакладзена на ёй бітумічная паверхня, якая здалёк напамінае асфальт.

— Многа аблагоў вакол нашага сяла. Як выйдзеш за вёску, то бачыш як зарастаюць яны кустамі, асотам у рост чалавека і бур’яном. Не ўсе маладыя, што засталіся жыць у сяле, хочуць займацца гаспадаркай, — расказвае спадар Казёл.

Васіль Казёл незадаволены прапановай пашырэння Нацыянальнага парку на ўсю Белавежскую пушчу. Жыхары Скупава падпісваліся нават пад пратэстам у гэтай справе.

— Раней многія вяскоўцы знаходзілі работу ў лесе. Цяпер працуюць там вонкавыя прадпрыемствы, якія прывозяць сваіх работнікаў, — гаворыць Васіль Казёл.

У агульным жыхары Скупава выказваюцца супраць прадавання зямлі выпадковым людзям.

— Гараджане сталі купляць у нас поле, каб атрымаць еўрасаюзныя даплаты. Кажуць, што цяпер не будуць даваць даплатаў за лугі тым, што не гадуюць кароў, — тлумачыць спадарыня Дрозд.

— Чалавек з Гайнаўкі купіў у нас і ў суседніх сёлах пад 90 гектараў поля. Зямлю набылі таксама жыхары Белавежы і Беластока. У многіх выпадках поле зарастае пустазеллем. Няма ўжо зямлі для продажу, — кажа спадар Казёл. — Людзі цяпер не рашаюцца так часта пазбывацца бацькаўскага поля.

У Скупаве жыве некалькі малодшых сямействаў. Некаторыя ездзяць на працу ў Нараўку. Дарабляюць яны на невялікіх гаспадарках.

Аляксей МАРОЗ

Мая Трансмалдавія

— 7 —

Прыднястроўе часта называюць чорнай дзіркай Еўропы: логавам кантрабанды, наркабізнесу, гандлю органамі і жывым таварам. Польскае пасольства ў Кішынёве не бярэ адказнасці за сваіх грамадзян-наведвальнікаў.

Сапраўды, ПНР кшталтам напамінае шпарку, якую можна перайсці ўшыр пяшком за тры-чатыры гадзіны. Так мяркуе Бора, які адзін на ўвесь аўтобус хвалюецца па страце часу.

Іншыя пасажыры смажацца на сонцы і, стуліўшы вушы, слухаюць лакальнае радыё дзе ідзе бясконцы канцэрт пажаданняў.

— О, ёлкі-палкі! — наракае Бора, здаравенны хлапец з лысым чэрапам. — За гэты час, мы б пяшком у Малдову зашагалі.

Бора вяртаецца з Адэсы, дзе працуе ў „адной фірме".

Сам ён з Бандэраў, якія пасля вайны 1992 года апынуліся ў Прыднястроўі. І зараз, калі разам сядзім за адным столікам у бары на мяжы, ён распытвае нас пра замежных студэнтаў. Хто яны? Якая ў іх мэта? І чаму так доўга трымаюць іх на пагранзаставе?

У Прыднястроўі лепш не ставіць пытанняў. Нават, калі яны дзеля падтрымкі бяседы.

— То колькі яшчэ будзе кіламетраў да мяжы з Малдавіяй? — пытаю.

Праз нейкі час чуем адно трэскат ігральных аўтаматаў, якімі загружаны ўсе адэскія і прыднястроўскія бары. Асілак моршчыць лоб, на яго чэрапе зіхацяць буйныя кроплі поту. Ён глядзіць на нас з дакорам. Пасля без слова адыходзіць ад століка.

Паводле верагодных крыніц, ПНР самая мілітарная краіна ў свеце. Кожны чацвёрты яе жыхар служыць у яўнай або ў тайнай паліцыі або ў арміі (у ПНР да 550 тысяч жыхароў).

Замежны наведвальнік, асабліва з варожага Захаду, падазроны тут у тры разы. У Ціраспалі, перш чым на жаданае месца, таксіст па ўласнай ініцыятыве вязе на пастарунак міліцыі.

* * *

Аўтобус можа рушыць. У гэты раз трымалі яго тры з паловай гадзіны. У тормазе абвінавачваюць нас і студэнтаў. За праезд цераз ПНР хлопцы плацяць па сорак долараў ад галавы. Іх новая „віза" прадстаўляе сабой скамечаны лісточак паперы з ручным надпісам: „Транзит разрешается!"

— А вас чаму адпусцілі? — цікавяцца нашым шчаслівым паваротам.

— Бо мы амаль рускія, — жартуем з Т. Тлумачым ім, што апірышча ідэалогіі ў ПНР — гэта славянафільства!

Праз момант адчуваем сябе быццам калабаранткі. Папраўдзе ў нас не было радасці ад заашчаджаных грошыкаў. Перад намі была яшчэ адна мяжа, прыднястроўска-малдаўская. А раптам там пацікавяцца нашым *шчасцем* і вернуць у Прыднястроўе? І як адтуль пасля выбрацца? Журналістаў з ходу абвінавачваюць у шпіёнстве, замыкаюць у турме.

Словам — няма добрага выбару.

Перад ад'ездам у наш аўтобус заходзяць салдаты з аўтаматамі. Пры паяску пачэпленыя тоўстая дубінка і казацкі нож. Пад іх эскортам будзем аж да мяжы ў Бандэрах. Апрача сваёй арміі ў ПНР з 1992 года стаіць Міратворчая місія. Яе састаў арыгінальны — у ёй адно прадстаўнікі Расіі ды Украіны. Сама краіна напамінае мініяцюру СССР. У рэспубліцы пражывае 28 нацыянальнасцей. Сярод меншасцей найбольш расіян — 28 працэнтаў, і ўкраінцаў — 25 працэнтаў.

Малдаване складаюць адно трэцюю частку грамадства. Афіцыйна прызнаныя тры дзяржаўныя мовы: малдаўская — запісаная кірыліцай, руская і ўкраінская. На практыцы дамінуе руская.

* * *

ПНР ужо з першых кіламетраў паказалася дзіўна знаёмай краінай — яна ў многім напамінала Калінінградскую вобласць. Не ідзе адно пра знешні кшталт тэрыторыі, якая напамінае касу. Прыднястроўе цягнецца паўз 200 кіламетраў па чарнаморскім баку Днястра, найбольшая шырыня — 20 км.

Краіна выглядае як вайсковая часць. Абапал дарогі валяліся старыя заіржавелыя гарматы, прастрэленыя раекты, сям-там тырчалі заіржавелыя танкі. Паміж сметнікамі выстойвалі сучасныя танкі і сапраўднае войска. На вяршыне ўзгоркаў прыкмячаю бетонныя бункеры. Рэспубліка жыве ў чаканні вайны.

Сталіца хутчэй за ўсё палохае мілітарыямі. Ціраспальская вуліца здамінаваная прахожымі ў форме. На першы погляд — гэта мужчынская рэспубліка, прасякнутая пахам адрэналіну. Нягледзячы на савецкія лозунгі пра мір і працу, з закавулкаў веяла агрэсіяй і духам вайны. У жэстах мужчын адчувалася катэгарычнасць, патрэба заваёвы. З другога боку тут як нідзе больш дыхала роспачу пражэртай матэрыі. Ззяла з яе бясілле, утопія. На гэтую хворую карціну накладаўся голас, які даходзіў з прыднястроўскага радыё. У перапынку паміж слязліва-мляўкім канцэртам па заяўках

прамовіў прэзідэнт Ігар Смірноў (трынаццаць год на прэзідэнцкай пасадзе).

Найперш пахваліў ён за багатае жніво, пасля напалохаў драпежнай Малдавіяй, якая дзень і ноч праводзіць манеўры па другім баку Дняпра.

Праз момант, здалося мне, што я на беларускім Палесі; дзеля гэтага параўнання спрацаваў пах балота і статуі Суворава, якога таксама ўпадабалі ў ПНР.

Нягледзячы на стаянку, ніхто з пасажыраў не жадаў прагуляцца па тратуарах сталіцы. Наадварот, калі аўтобус зрушыў з месца, у кампаніі пачалі жартаваць. Толькі адзін Бора, які пакінуў нас у прыднястроўскіх Бандэрах, выглядаў на прыгнечанага. Хлапец памахаў нам добразычліва на дарогу, а пасля знік у хмары жоўтага пылу.

Ева СЦЕПАНЮК

Фота www.rower.fun.pl

Альбом „Нівы"

У сувязі з 50-годдзем тыднёвіка Праграмная рада „Нівы" выдала фотаальбом „Час і людзі 1956-2006".

У альбоме змешчана больш за 500 фотаздымкаў людзей, якія працавалі і працуюць у „Ніве", якія пішуць у газету і чытаюць яе. За 50 гадоў журналісты „Нівы" аб'ехалі ўсе куткі паўднёва-ўсходняй Беласточчыны, пабывалі ў розных школах, дзе навучалася беларуская мова. Здымкі паказваюць вясковае басаногае дзяцінства далёкіх пасляваенных гадоў, бедную вопратку таго часу. Кантрастуюць з імі сучасныя здымкі „Зоркі". Цяперашнія школьнікі сытыя, вясёлыя і прыгожа адзетыя.

Першая частка альбома прысвечана людзям — стваральнікам „Нівы", якія адышлі ўжо на пенсію і тым, хто адышоў назаўсёды. Другая частка — гэта маладое пакаленне рэдактараў, журналістаў, карэспандэнтаў і чытачоў тыднёвіка. Напрыканцы альбома знойдзем вершы паэтаў, друкаваныя на старонках „Нівы". Сярод іх вылучаецца верш „Беластоцкі край" Алеся Барскага, які стаў сучаснай песняй:

Сямятычы і Гайнаўка, і Бельск старынны,
Саколка ціхая, зялёная Дуброва.
Любоў да вас — мая адвечная павіннасць
І вернасць матчынай спрадвечнай мове.

Здаецца, больш ніхто так проста, шчыра і прыгожа не напісаў аб Беласточчыне. Альбом „Час і людзі" з'яўляецца прыгожай хронікай мінулых гадоў, добрай памяткай для беларусаў Беласточчыны. Варта паглядзець альбом „Нівы".

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Імпрэза ў ТБК Літвы

25 лістапада г.г. Таварыства беларускай культуры ў Вільні адзначыла слаўную дату беларускай гісторыі — Слуцкі збройны чын, альбо Дзень герояў.

Зала ТБК упрыгожаная была плакатамі аб гераічным учынку беларускіх патрыётаў у 1920 годзе, якія пайшлі паміраць, каб жыла Беларусь. Сябра ТБК Алесь Адамковіч цікава распавёў аб прычынах і падзеях Слуцкага паўстання. Андрусь Старавойтаў праспяваў патрыятычныя песні, прысвечаныя гэтай даце. У другой частцы імпрэзы адбылася прэзентацыя кнігі „Галасы разбуджаных птушак" беларускага краязнаўца і гісторыка Міхася Казлоўскага. Рэцэнзію на кнігу зрабіла Леакадзія Мілаш.

Аўтар выдаў вельмі цікавую, насычаную фактычным матэрыялам, праўдзівую кнігу, прысвечаную памяці людзей, якія пры ўсіх акупацыях верна служылі справе беларускага адраджэння, але якім сёння ў Беларусі не знайшлося месца і належнай павагі да іх памяці.

Пры поўнай зале людзі не хацелі разыходзіцца і жадалі ўсё яшчэ слухаць змястоўны аповед самога аўтара. За кубкам кавы яшчэ доўга абмяркоўвалі слаўную дату нашай гісторыі, яе лепшых сыноў і дочак, а таксама дзякавалі аўтару за цэнную кнігу. Грамада ТБК падтрымала ідэю аб зборы грошай для аўтара на выданне наступнай кнігі.

Хведар НЮНЬКА

Ганна Кандрацюк (redakcja@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 52 —

— Купі мне, мама, сёння „Выбарчую газету", — Гражынка, як і ўсе яе аднакласнікі, раптам захацела ў апошнія дні набыць тоўстае газецішча, пра якое тата кажа што ў ім ёсць усё, а бабуля — што нічога, апрача аб'яў, паведамленняў ды палітыканства. Дык Грак адразу пацікавіўся: нашто куча задрукаванай паперы, з якой палову адразу не чытаюць? Хіба ж не на распалку ў печы? Нават малюнкаў мала, каляровых, каб было на што паглядзець. Тата купляе газету, кажа, што добра ведаць пра тое, што пішуць разумныя людзі. А бабуля адказвае, што ў кожнага чалавека свой розум і няма чаго на чужы спадзявацца.

— Тата прынясе з працы, калі, прачытаўшы, там яе не пакіне. Я ад яго забіраю толькі дадатак для жанчын „Высокія абцасы".

— Гэта жанчыны — дадатак да высокіх абцасаў! — прыгадаў крылатую думку Грак, якую пачуў быў у нейкай перадачы. І вырвалася яму з дзюбы такая недарэчнасць — дзе большасць істот гэта жанчыны!

— Ты хацеў сказаць, што мы адно нейкі дадатак?! — Гражынка ўжо забылася, пра што гаворка: пра дадатак у „Выбарчай газеце" для вучняў шостых класаў — рэпетыцыю перад экзаменамі ў гімназію. Тут усе жанчыны стаялі як прадстаўніцы ўсяе жаноцкай часткі чалавецтва. Каб нейкае там пташыдла жартачкі з іх рабіла! Абцасы!..

— Я гэта так... Прагаварыўся. Праляцеўся... Чуў у тэлевізары... Гэта, так сказаць, метафара... Ці тая самая, пара...тое.. пера... большанне.

Бабулін тапцік, зусім без абцаса, праляцеў Граку каля вуха. Аж свіснула.

— Ай, гвалт! — залямантаваў Грак. — І гэта называецца адкрытае грамадства! Свабода думкі! Гэта звычайнае парушэнне правоў мае асобы! Я вас... Я ў Страсбург напішу! Хай уся Еўропа ведае... Хто тапцем ваюе, сам ад тапця гіне! Няма чаго смяяцца! Правапарушэнні гэта нясмешная справа. Тым больш, што я тут у меншасці. Мікітка, падтрымай мяне. Ты тут увесь свет праспіш! Слухай, тут мяне пакрыўдзілі!

— Каго-каго? — перапытала бабуля. — Слухайце, кабеткі! Вось якое кві-пра-кво!

— І квікаюць, і квокаюць у гэтай хаце! — якраз увайшоў тата з „Выбарчай газетай" пад пахай. — Давай, тата, газету! А дазволіш мне вырваць дзве старонкі?

— Будзем рваць, рваць, рваць! — і Грак, і Мікітка, забыліся пра ўсю палітыку.

Міра ЛУКША

Мы не хвалюемся!

Клас V „а" з выхавацелькай Міраславай Маркевіч

— Ну, а цяпер прызнавайцеся, толькі каб мне не манілі, — просіць сваіх выхаванцаў, пяты „а" клас, настаўніца Міраслава Маркевіч. У класе слухаюць, аж дзіўная гэтая цішыня. Яшчэ да сустрэчы настаўніца папярэдзіла мяне:

— Гэта самы жулікаваты ў школе клас!

— Скажу праўду, цікава пабываць у такіх класах, дзеці ўмеюць здзівіць. Тут проста кожная галава жывая — такі банк добрых ідэй! Вядома — выключна тады, калі захаваная мяжа добрага смаку.

— Сустрэча з „Зоркай" гэта ўзнагарода. За актыўнасць ды цікавасць да беларускай мовы і, вядома, да нашай газеты!

— А што найбольш вам падабаецца ў „Зорцы"? — пытаю.

— Усё!

— Усё значыць тут, перш за ўсё, вясёлыя вершы Віктара Шведа, крыжаванкі, Галерэя „Зоркі" і, вядома, „Муха ціп-топ" са смешнымі малюнкамі. Тыя героі часта напамінаюць сяброў з іх класа. Ёсць тут хлапчук як „скапіраваны" Міколка (найбольшы жулік у школе), які ў час сустрэчы ўсё круціцца, быццам пасадзілі яго на спружынах. Вядома, самога ды яшчэ на апошняй парце:

— Наш клас самы „нягжэчны" ў школе, — прызнаецца Мадзя Сахарчук. — У нас найбольш заўваг у дзённіку, настаўнікі наракаюць, што мы „разрабляем" на ўроках.

— І добра вам з гэтым жывецца?

— Не!!! — чуем калектыўны адказ, толькі адзін „Міколка" стараецца перакрычаць грамаду воклічам „так!". Аднак яго заглушаюць сябры.

— А хочаце, каб міністр адукацыі паслаў вашых жулікаў у карныя класы?

— Не!!! — пратэстуюць сябры.

Паўліна Іванюк заяўляе, што ўсё ж такі іх клас файны! Ён вялікі — 30 вучняў, у тым ліку 16 дзяўчат і 14 хлопцаў.

— А што найбольш любіце разам рабіць? (цікава, што тут не прагучыць банальны адказ пра спорт ці камп'ютэрныя гульні).

— Найбольш любім гуляць у тэатр, — кажа Наталля Гвоздзей.

Пра апошнія пастаноўкі распавядае Аня Кірылюк, выдатніца па беларускай мове:

— У гэтым годзе мы ўжо падрыхтавалі „Ноеў каўчэг" на англійскай мове ды беларускую лінейку пра патрона школы Яраслава Кастыцэвіча.

— Мы расказвалі пра яго жыццё і дэкламавалі вершы Віктара Шведа і Надзеі Артымовіч, — дадае Аксана Леанюк.

Усе вучні пятага „а" класа ганарацца сваім патронам Яраславам Кастыцэвічам. Ля насценнай газеты, прысвечанай патрону, часта фатаграфуюцца героі Галерэі „Зоркі".

У V „а" кожная галава жывая

ЗОРКА

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 8 —

Калі я ўчора сядзела „на асьцы”, Ганка даслала мне інтэрнэтны адрас: www.Byk26.fotka.pl. Я хуценька ўвайшла на гэтую старонку і пабачыла на ёй тры здымкі настаўніка фізкультуры — спадара Геніка Ляскоўскага. На першай фотцы ён абдымаў дзяўчыну, якая на сабе мела толькі станік. На другім здымку ён трымаў у руцэ куфаль піва. А на трэцім Ляскоўскі прэзентаваўся без кашулі ды хваліўся сваёй мускулатурай ды аброслым торсам. На нізе, пад гэтай галерэяй, красаваўся нумар „аські” Ляскоўскага, які я сабе запісала. Пасля гадзіны, здаецца, ужо ўсе вучні нашай гімназіі пабачылі здымкі Ляскоўскага. Я і мае сяброўкі гаварылі з Ляскоўскім па Інтэрнэце, але ён хутка нас заблакіраваў, здаецца, адчуў наш малады ўзрост.

Генік Ляскоўскі ведаў ужо, што вучні пабачылі яго здымкі ў Інтэрнэце, але чамусьці не падумаў іх выкінуць. Аднак тое, што зрабіў Міколка, прымусіла яго да рашучага дзеяння. Мой сябра даслаў на электронную пошту нашай школы адрас: www.Byk26.fotka.pl. Настаўнік інфарматыкі, Пятрусь Занеўскі, адразу паказаў усё спадарыні Воўк і яна, як не цяжка здагадацца, страшэнна была ўзбударажаная пабачаным.

— Гэта ж неадказны чалавек! — крычала дырэктарка, — калі гэтыя здымкі пабачаць вучні, яшчэ набяруцца дурных прывычак і самі стануць выстаўляцца ў Інтэрнэце!

Калі на другі дзень Генік Ляскоўскі паказаўся ў школе, Міколка хадзіў яго следам і крычаў:

— Гэй, бык! Бычок 26! А дзе ваша піва? Прыгожая ў вас дзяўчына!

Настаўнік быў збянтэжаны словамі жуліка. У дадатак дырэктарка паклікала яго да сябе:

— Вы не разумееце, што Інтэрнэт вельмі папулярны сярод моладзі і што кожны можа пабачыць вашы здымкі?! Яны псуюць рэпутацыю нашай школе! Прашу як найхутчэй прыбраць іх з сайта, бо інакш...

— Добра, добра! — „Бык 26” шчыра пакаяўся ды паабяцаў выправіць памылку.

Вечарам не было ўжо сайта Byk26.fotka.pl. Але сёння хтосьці зрабіў спадарыні Воўкі тры здымкі і паставіў іх на сайце fotka.pl. Не ведаю хто зрабіў такі жарт, але калі пабачыць іх дырэктарка, яна разарве на дзве часткі аўтара здымкаў.

тэкст: <natasza9922@wp.pl>
дызайн: <lolcia05@wp.pl>

Галерэя „Зоркі” (Нараўка)

Магда Каліноўска

Фота Ані Кандрацюк (Нараўка)

У жыцці хачу стаць, чаму: У будучыні хачу быць акцёркай. Ведаю, што гэта вельмі цяжкая прафесія, але я люблю выклікі.

У сяброў цаню: Шчырасць і тое, што нікому не раскажуць маёй таямніцы

Не люблю: Прыбіраць свайго пакоя і мыць талеркі. Яшчэ не люблю сварыцца, але часам бывае інакш.

Па-беларуску размаўляю: З маімі бацькамі, з дзядулямі, цёткамі, часам з маімі сяброўкамі.

Мой любімы гурт гэта: „Акцэнт” з Румыніі. Іх музыка мне вельмі падабаецца.

Каля свайго дому пасаджу: Пальму, каб штодзень думаць аб трапічных краінах і канікулах.

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5.3

Твая мянушка: Некаторыя называюць мяне Мадзяра

На нашых старонках, звычайна, друкуем лісты ад сімпатыкаў. Апошнія, здавалася б , увогуле не цікавяцца беларускімі справамі. Аднак нядаўна па электроннай пошце мы атрымалі ліст ад piker10@op.pl, які гучыць як скарга на лёс:

Dzień dobry! Mam pytanie. Mam waszą gazetę Zorka bo moja siostra musi brać co tydzień (nie wiem czemu). Chodzę na białoruski ale nie bardzo przepadam bo na Języku białoruskim bardzo czas się ciągnie. Dobra, teraz do tego pytania. Jak zrobić żeby szybciej czas szedł??? Bardzo was proszę żeby pisaliście po polsku i jeszcze odpisaliście dziś!

Ад „Зоркі”: Пікусь, даражэнькі!!! Прабач, што мы табе адразу не адпісалі. Спачатку ўвогуле не думалі пра гэта. Хачу толькі сказаць, што твае прэтэнзіі могуць быць апраўданыя, ніхто не любіць быць нявольнікам. На апошнюю тваю просьбу можам адказаць прыкладам са школьнай парты. Уяві сабе, што ты на ўроку англійскай мовы і там прапануюць табе газету па-польску. Падумай!

Вершы Віктара Шведа

Дапамога беспрацоўным

— Тата, ты дай мне нейкую працу,
Каб мог зарабіць на білет у кіно.
— Не можаш, сынок, ад мяне дамагацца,
Занятку табе я не маю ізноў.

— Калі няма працы, прашу памяркоўна,
(Працы пазбаўлен не адзін мільён),
Дапамогу мне выплаці, я ж беспрацоўны,
Такі ў краіне існуе закон.

Польска-беларуская крыжаванка № 50



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 46: Бот, ток, мілы, лата, Ас, літара, сарока, кіт, акт, ост, трактар. Бук, скіт, ліст, мата, як, гітара, ларок, ты, актор, куст, сто.

Узнагароды, аўтаручкі (cienkopisy), выйгралі: **Марта Каранецкая** з Нарвы, **Анжаліка Сапяжынская, Юстына Анішчук, Кася Капытка, Эвеліна Хіліманюк, Аня Анікюк, Наталля Янцэвіч, Кася Саковіч** з Чыжоў, **Аніта Дмітрук, Філіп Капацкі, Кшыштаф Парфянюк, Рафал Селіванюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Гісторыя адной сям'і

Хлеба ў нас, баценька, часам не хапала. Сям'я вялікая. Разам з бабуляй Ганусяй — сем чалавек. Затое яблычак было ўволю. На дварэ мароз трашчыць, а ты нам прыносіш з клуні яблычкі, румяныя, чырвоныя, якія ў скрынках ты схаваў у сена...

УСПАМІН ПРА ЖЫЦЦЁ МАКСІМА БРУЧКО

Дарагі баценька, ужо шосты год, як мы не сустракаемся, не ўспамінаем мінулага, як бывала. Ты адышоў. Пішу і лічу гады: ну так, ужо ж сто трэці год ад твайго дня нараджэння. У вёсцы Войшкі. Бачыш, а ўсё жыццё пражыў у Плёсках. Там знайшоў сваю прыгажуню Ольгу, сваё шчаслівае месца на зямлі. І толькі аднаго года замала, каб можна было святкаваць ваша „дыяментавае вяселле".

Дачакаў ты чатырох дочак, дзесяці ўнукаў і аж чатырнаццаці праўнукаў. Гаворыш, быў час шчаслівым? Так, баценька, быў. Помню, як ты казаў маці: „Чым жа мы, Олько, заслужылі ў Бога — і самі жывем доўга, жывуць усе ўнукі і праўнукі; унукі нашы вучаныя — прафесары, дактары, інжынеры... Як прыемна гасціць усіх на Спаса. Яны нас не забываюць..."

Прыйшоў ты ў Плёскі, як кажуць, „на голую крапіву" — не было гаспадара. Як добра, што вывучыў ты сталярку. Не паслухаў бацькі Пятра, не хацеў быць, як ён, краўцом, шыць кажухі. Уцёк да цясёлкі. Яшчэ ў Войшках людзі ведалі, што ў кожную суботу вяртаешся з работы. Ну, казалі, ужо Максім Мікалаеўскі (там цябе не называлі Бручком) ідзе дамоў. Спявае, аж рэха нясе. Вельмі ж любіў ты спяваць і меў добры голас, як баба Дарка, якая была з Ляшэўскіх. А яны ўсе спявалі, аж сцены дрыжалі і газнікі гаслі!

Максім Бручко з сяброўкай з Брэста

А цясёлка прыдалася ў войску. Расказваў ты мне: „Служыў я ў горадзе Брэсце, добра мне было, у сталярні, рабіў мэблю. А ў нядзелю хадзіў спяваць у касцельны хор. Выбралі былі нас 20 чалавек з ліку 300 салдатаў". Таму ты, баценька, ведаў усе калядныя песні, рускія і польскія. А і мне люба было паслухаць вясёлую песеньку „Як камар з камарыхай ажаніўся", тваю ўлюбёную.

А, помніш, апошні раз, на Каляду, 2001 года, мы з табою і Верай Валкавыцкай праспявалі ўсе калядныя песні. Веру ты лічыў за сваю дачку. Яна не баялася асату і вазіла з табою грэчку, умела кіраваць канём, не тое што я, баязліўка. Вера была ў нас заўсёды і да канца.

Гаворыш, што замала ты бываў дома, калі дзеці былі малыя. А я памятаю, як вяртаўся ты з Кнаразоў у суботу, прыносіў гасцінец — булкі з капустай, іншым разам з дыняй. З дыняй я не любіла, затое з капустай — вельмі, так як і ты. Паставіў ты, як палічыў, каля ста хатаў, найбольш у Кнаразах. Цябе ўсе ведалі, любілі і паважалі. Бо і ты любіў людзей.

Максім Бручко (першы злева) сярод салдат у арміі ў Брэсце

Затое зімой ты быў дома. Памятаю, як я, маленькая, грэлася на печы, а ты сабраўшымся суседзям на вячорках чытаў уголас „Тараса Бульбу". Чытаць ты добра ўмеў — хадзіў у школу ў бежанстве. Нядаўна расказваў найстарэйшы твой унук Генік: „Я на падстрэшку знайшоў быў сярод дзедавых кніжак кнігу пра мора, і тады менавіта рашыў стаць мараком". Апошнюю кнігу, „Анну Карэніну", ты ўжо не паспеў дачытаць.

Штотыдзень пісьманосец прыносіў табе дахаты сельскагаспадарчую газету і абавязкова беларускую „Ніву" — там усё было напісана пра нас, гаспадароў.

Хлеба ў нас, баценька, часам не хапала. Сям'я вялікая. Разам з бабуляй Ганусяй — сем чалавек. Затое яблычак было ўволю. На дварэ мароз трашчыць, а ты нам прыносіш з клуні яблычкі, румяныя, чырвоныя, якія ў скрынках ты схаваў у сена. Быў у нас вялікі сад, былі яблыкі, грушы, слівы, вішні, парэчкі, маліны, трускалкі, якія ты як адзін з першых прывёз ад бабы Даркі. Расказваў, што трускалкі ў Войшках паявіліся першымі, баба Дарка з іншымі жанчынамі ўначы хадзілі „красці" памаладкі ў вёску Рэпнікі. Гэта таму цябе ў Плёсках называлі „Мічурыным". Нават пчол ты гадаваў. Да сёння чую на вуснах смак васкавіны ацякаючай свежым мёдам.

А памятаеш, як паехалі мы ў лес шукаць елачку, заўтра ж каляда. Елачкі не знайшлі, высеклі сасонку. Вяртаючыся, глядзелі ў яснае месячнае неба, а ты расказваў мне пра зоркі, Млечны Шлях... А калі мы чакалі зорку, прыносіў дахаты сена і ставіў у куце зробленага з каласкоў „дзеда". Ты стараўся захоўваць усю традыцыю кожнага свята.

А калі пайшла я ў школу, штодзённа пераглядаў мае сшыткі, крычаў, што неахайна пішу. Тады зрабіў мне „сумку" з фанеры, каб сшыткі былі простымі і чыстымі. А як ты ганарыўся, калі маці прыносіла пахвалы з бацькоўскай сустрэчы!

Першы злева ў другім радзе Максім Бручко ў школе ў час бежанства

Дзеці раслі, а ты заняўся быў гаспадаркай, хоць яшчэ доўга рабіў людзям цясёлку. Цяпер і маці было лягчэй, не мусіла рабіць мужчынскай працы. Дзеці хутка дараслі, пайшлі з хаты, а вам з мамай было штораз цяжэй гаспадарыць. Праўда, памагалі вам дзеці пры ўсіх цяжэйшых працах. Любіў ты работу, вельмі доўга не хацеў ісці на пенсію. А на дадатак знайшоў сілу, каб заняцца працай у царкве. Трэба, вось, паставіць агароджу вакол царквы — ты і рабіў. Каля 20 гадоў ты служыў царкве, быў старастам. Не прапусціў нядзелі ні свята — раненька бег у храм. Ужо ты меў свае гады, а на кожную ўсяночную, памятаю, зрываўся ў поўнач, калі я, маладая, ленавалася злезці з пасцелі. А колькі гадоў насіў ты плашчаніцу, апошні раз — у свае 92 гады. За гэта паважалі цябе і плёскаўскі бацюшка Уладзімір Шумікоўскі, і прыхаджане, а мітрапаліт Васілій узнагародзіў цябе медалём Марыі Магдаліны. Якое прыгожае слова сказаў бацюшка на развітанне з табою! Вялікі яму дзякуй.

Гаварылі — доўга, вельмі доўга ты жыў: аж 97 гадоў. А мне здаецца: так коратка, усё — закоратка! Ну, што ж, як спяваў Булат Акуджава, „никому две жизни не дано". Нам трэба яшчэ жыць, як ты казаў — для дзяцей, унукаў, а можа і праўнукаў. Ты застаўся ў нашай памяці і далей паказваеш нам дарогу, па якой нам ісці.

Цяпер мы з табой сустракаемся ў снах. Нядаўна ты мне сказаў: „Дочанька, як Там прыгожа!" Веру, баценька, веру. Ты мне калісь пісаў у Амерыку: „Слеза летит, рука дрожит, посмотрю в окошко, подожду немножко". І дачакаўся ты мяне.

Хата Максіма Бручко ў Плёсках, 1960-ыя гады, адна з сотні ім пастаўленых і аздобленых

Цяпер таксама, калі я пішу пра цябе ў тваю гаспадарскую „Ніву". Да сустрэчы.

Ніна БРУЧКО

Фота з архіва сям'і Бручко

Адно пытанне: чаму па-руску?

Першы раз пасля некалькіх гадоў у мінулы уік-энд на падмостках беластоцкага Тэатра імя Аляксандра Вянгеркі выступіў Драматычны тэатр з Гродна. Гэта пачатак узноўленага супрацоўніцтва абодвух драмтэатраў. Гродзенцы паказалі пастаноўку „Рок-концерт с Григорием Гориным".

Гродзенскія артысты выступілі двойчы. На першай пастаноўцы ў першых радах заселі м.інш. шэфы Беларускага грамадска-культурнага таварыства Ян Сычэўскі і Валянціна Ласкевіч ды консул Рэспублікі Беларусь у Беластоку Вадзім Палякоў. Зала, аднак, бітком не была набітая. З зацікаўленнем глядзелі пастаноўку дзве гадзіны (без перапынку) вучні беларускага ліцэя ў Гайнаўцы. Большасць з іх пасля спектакля не хавала расчаравання:

— Шкада, што быў ён па-руску, а не па-беларуску.

Прэм'ера „Рок-канцэрта..." адбылася ў лютым 2001 г. Гэта незвычайная пастаноўка па сюжэтах папулярнага драматурга і сатырыка Рыгора Горына. Сцэнарый узнік на падставе апавядання „Здарэнне на фабрыцы-6", п'есы „Феномены" і радыёп'есы „Рэінкарнацыя" (І прэмія ў конкурсе Радыё Галандыя „Калі зваліўся мур"). Пераплецена ўсё песнямі з роду — як гэта называюць крытыкі — „інтэлектуальнага рока", м.інш., гуру гэтага віду расійскай музыкі, перш за ўсё з перыяду перастройкі, Барыса Грабеншчыкава. Музыка і ўвогуле гук выконвае тут некалькі функцый, па-за каментатарскай, час ад часу становіцца адным з герояў-расказчыкаў. У спектаклі іграе сем чалавек. Сцэнічнае афармленне аскетычнае: некалькі рам, якія выконваюць самыя розныя функцыі, галоўным чынам вызначаючы месца падзей, чамаданы, якія бываюць мэбляй, школьная дошка, лесвіца. У левым рагу — узвышэнне, на ім два мікрафоны, якія спатрэбяцца чатыром музыкам, але і будуць рэквізітам галоўнай восі акцыі. Асноўны інструментарый: пульт-сінтэзатар і дзве гітары: класічная і электрычная. Гледачы яшчэ да спектакля бачаць інтэр'ер сцэны. Разам з героямі пераносяцца з вуліцы ў кватэру эканома адной фабрыкі — Яўгена Пятровіча Ларычава (заслужаны артыст РБ Сяргей Курыленка) і яго жонкі Любові Мікалаеўны (Святлана Літвінёнак). Тут разыгрываецца асноўная частка драмы, якая кіпіць у душах дабрэйшага, уражлівага Яўгена Пятровіча ды майстра вульгарнасці, хоць не пазбаўленага „рускай душы" Ягора Сцяпанавіча Клягіна (Аляксандр Шаўкаплясаў). Ёсць яшчэ хамула і прасцяк з фабрыкі эканома Прахораў (Генадзь Мушперт; заадно рэжысёр і аўтар інсцэніроўкі) ды дачка Клягіна — Маша (Аксана Плікус), свайго роду пакутлівая душа, якая выконвае ролю расказчыка ў свеце свайго бацькі. Ігра акцёраў, асабліва пары галоўных герояў — паказ сцэнічнага майстэрства, вытрымкі драматычнага рытму, пабудовы канфліктаў, часам праніклівага адыгрывання цішыні.

„Вы зрабілі сюрпрыз. Вы нас проста знакаўціравалі ў тэатральным значэнні гэтага слова! Я ўбачыла выключны спектакль. Усё дашліфаванае і дапрацаванае ад пачатку да канца", — пісала аб гродзенскім спектаклі тэатральны крытык з Масквы Элеанора Макарава. Гэтую ацэнку без сумнення пацвердзіла рэакцыя беластоцкіх гледачоў. Амаль з авацыямі, стоячы, дзякавалі яны стваральнікам пастаноўкі, якая расказвала аб прасторы, што раздзяляе людзей, саветызаваных у думанні і паводзінах, аб крыўдах ад Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўсяе пазнейшай сістэмы ўведзенай бацькам-правадыром Уладзімірам Ільічом Леніным і яго наступнікамі, урэшце — аб пошуках надзеі. Не толькі ў расійскім кантэксце, але і беларускай рэальнасці як запавет прагучалі словы аднаго з герояў:

— Нашы дзеці будуць разумнейшыя і больш свабодныя за нас.

На гэтых двух паказах новае супрацоўніцтва беластоцкага і гродзенскага драмтэатраў не закончыцца. Дырэктар Тэатра імя Аляксандра Вянгеркі Пётр Дамброўскі ў размове з „Нівай" сказаў:

— Мы хочам бываць адны ў адных. Паказваць гродзенскія спектаклі ў нас, а нашы — у Гродне. Гэта падстава супрацоўніцтва. Калі знойдуцца грошы ў Міністэрстве культуры, у лютым хочам давесці да рэалізацыі народнай часткі „Дзядоў" Адама Міцкевіча, без Трэцяй часткі, вельмі важнай для нацыянальнага вызвалення. Я задумаў, што з Трэцяй часткі ўключым толькі Вялікую імправізацыю, але ў сэнсе нейкага бунту маладога пакалення. Хочам гэтае відовішча паставіць трохкультурна, трохмоўна: Польшча, Расія, Беларусь.

У гэтым праекце з расійскага боку меў бы ўдзельнічаць тэатр з Калінінграда. Дырэктар Дамброўскі не выключае таксама ў будучыні супрацоўніцтва з якімсьці з мінскіх тэатраў і нейкім украінскім. Кантакты з гродзенскім тэатрам мелі — згодна з ідэяй шэфа беластоцкага тэатра — пачацца ўжо ў мінулым годзе. Аднак не ўдалося знайсці на гэтую мэту грошай. Падвёў Еўрарэгіён Нёман, які меў мець у гэтым свой удзел. Яшчэ на паўгадзіны да пачатку першага паказу „Рок-кацэрта..." у Беластоку дырэкцыі абодвух тэатраў складалі дамову аб далейшым супрацоўніцтве. Пагасла на сцэне асвятленне, і зноў яно стала фактам.

(раст)

Фрэскі з Супраслі — альбом

Самыя каштоўныя памяткі Музея ікон у Супраслі, паслявізантыйскія фрэскі з XVI стагоддзя — „героі" альбома, выдадзенага беластоцкім выдавецтвам „Паміж небам і зямлёй". Адмысловая прамоцыя гэтай незвычайнай кнігі праводзілася ў Падляшскім музеі, філіялам якога з'яўляецца Музей ікон.

Альбом адкрывае адбітак архіўнага здымка Благавешчанскай царквы, які паказвае яе выгляд з 1864 г. Дарэчы, у альбоме апынулася некалькі здымкаў гэтага храма з пералому стагоддзяў, а таксама адлюстроўваючых яго руіны пасля разбурэння ў 1944 г.

— Гэта помнік еўрапейскага маштабу, — адзначыла ў час прамоцыі Барбара Мушынская з Падляшскага музея.

Ва ўступе да альбома першаіерарх Беластоцка-Гданьскай епархіі епіскап Іакаў прыгадаў: „Адным з найбольш вядомых манастырскіх цэнтраў Праваслаўнай царквы на землях Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў быў Супрасльскі манастыр. Заснаваны на пераломе XV і XVI стагоддзяў, быў ён, як і ўсе тагачасныя манастыры, культуратворчым і асветным месцам".

Аўтарам тэксту ў альбоме з'яўляецца Аляксандр Сямашка, адзін з найбольш вядомых знаўцаў фрэскі. Запэўнівае ён у заканчэнні, што „не можам сёння паказаць ніякага іншага помніка з такой вялікай мастацкай каштоўнасцю". Анджэй Ляхоўскі, дырэктар Падляшскага музея напісаў: „Шаснаццацівечныя супрасльскія фрэскі маюць асаблівае месца ў польскіх музейных калекцыях. Лікі святых і мучанікаў, якія стагоддзямі ўпрыгожвалі інтэр'ер супрасльскай царквы, захапляюць не толькі сваёй красой і майстэрствам сваіх стваральнікаў. Малюнкі тонкіх, аскетычных фігур, тыповых для рэлігійнага мастацтва візантыйскага кола, у выпадку гэтай калекцыі здзіўляюць сваёй адметнасцю, непаўторнасцю. Нічога ў гэтым дзіўнага, што яны — канон у штудзіраванні гісторыі мастацтва".

Да сёння захавалася 30 фрагментаў супрасльскіх насценных выяў, сярод іх — сем постацей ва ўвесь рост. У Музеі ікон змяшчаюцца таксама дзве скрыні фрагментаў захаваных у такім стане, што іх — як сказала Барбара Мушынская — немагчыма паказаць.

Альбом выдадзены ў графічным афармленні і ў фармаце падобным на папярэднюю публікацыю выдавецтва „Паміж небам і зямлёй" *Malarstwo polskie,* у якой апынуліся творы пастаянна экспанаваныя беластоцкім музеем. Гэта першае выданне, падрыхтаванае з думкай аб Музеі ікон.

— Выданне сфінансавала выдавецтва. Музей ніколі не быў бы ў змозе выдаць такі каштоўны і элегантны альбом, — адзначыла Барбара Мушынская.

— Мы стараліся паказаць у выданні багацце фрэсак, — падкрэсліў Анджэй Сакульскі, дырэктар выдавецтва.

— Важная была эстэтыка. Мы не хацелі, каб гэты альбом прапаў на палі-цах сярод іншых кніг, — запэўніваў Андрэй Супрун, які графічна аформіў *Freski z Supraśla.*

Пры нагодзе выхаду альбома выдавецтва „Паміж небам і зямлёй" запрапанавала таксама каляндар на 2007 год, у якім апынулася 12 супрасльскіх фрэсак. Графічны выгляд дазволіў захаваць тую тонкасць і аскетычнасць фігур святых, аб якой успамінае ў сваім тэксце Анджэй Ляхоўскі. Працаўніцы Падляшскага музея і Музея ікон у час прамоцыі прыгадалі таксама, што супрасльская выстава будзе даступная ў мультымедыйнай форме ад паловы студзеня, а не, як прадбачвалася раней, ужо ў снежні. Справа тут у „зладжанні дэталяў". Фрэскі будуць мець спецыяльнае, сучаснае асвятленне, а нават маюць адсвечвацца. Змяшчацца яны будуць на спецыяльна прыпаднятай канструкцыі, каб падкрэсліць іх стройнасць і ўзнёсласць.

— Мы, усё ж, замала прыкмячаем каштоўнасць фрэсак. Гэта паслявізантыйскі, сусветны маштаб. Хочам, каб іх каштоўнасць бачылася і на Падляшшы, так як у Еўропе, а нават у свеце, — падкрэсліла Крыстына Мазурук, кіраўнік Музея ікон.

Альбом (цана 60 зл.) выдадзены тыражом 1 300 экз., а каляндар (20 зл.) — 1 000 экз.

Раіна СТЭФАНЧУК

http://force.info

Недзе на пачатку сучаснай беларускай незалежнасці, калі яшчэ па мінскіх тэлесігналах прыходзілі перадачы, у якіх можна было даведацца аб розных поглядах не толькі на палітыку, але і на старадаўнюю гісторыю, была і даволі цікавая праграма „Праспект", якую вёў добра знаёмы многім Павел Шарамет. Чамусьці запаў мне ў галаву сюжэт, у якім вядучы „Праспекта" пытаецца ў супрацоўніка адміністрацыі прэзідэнта Аляксандра Фядуты нешта наконт таго ці не пойдзем мы туды, куды нас кліча БНФ — у Вялікае княства Літоўскае. „Не", — цвёрда адказвае Фядута, прытым запэўніваючы сябе, вядучага і тэлегледачоў у тым, што мы — сучасная беларуская краіна, якой зусім непатрэбна рабіць рэверансы ў бок сярэднявечча.

Прайшло больш за 10 гадоў. Беларускія ўлады зусім не згадваюць аб прынцыпах народаўладдзя, закладзеных у літоўскіх статутах. Лёсам Шарамета і Фядуты не пазайздросціш — абодвум не знаходзіцца месца ў лукашэнкаўскай Беларусі з-за апазіцыйнасці да ўлады. Ідэі ж калыскі беларускай народнасці — ВКЛ, як сказалі б камуністы, жывуць і перамагаюць. Адным са сведчанняў таго з'яўляецца сайт „Вялікае княства", які месціцца ў Інтэрнэце па адрасе: http://3force.info.

Нягледзячы на адносна сціплае выяўленне галоўнай старонкі партала, зроблены ён даволі арыгінальна. Уверсе на цёмным фоне выяўлення і разгорнутай старадаўняй кніжкі месціцца назва сайта, якая дублюецца па-англійску.

Пачынаецца старонка пачаткамі гістарычных рэфлексій на сучасныя тэмы. Унізе месціцца тое, што звычайна называюць навінамі, але распрацоўшчыкі і натхняльнікі „Вялікага княства" назвалі гэтую падрубрыку „Факты". Інфармацыя, якая там падаецца, тычыцца падзей культурнага жыцця. Тут распавядаецца аб розных імпрэзах, якія з большага маюць тую ж гістарычную накіраванасць, а таксама аб рэстаўрацыйных працах на розных помніках беларускага дойлідства.

Усе выйсці да рубрык сайта месцяцца ўверсе. Праўда, нешта не дапрацавалі стваральнікі „Вялікага княства" і першая рубрыка, якая ідзе пасля „Пачатку", аказваецца зусім не „Форумам", як пазначана, а FAQ (Frequently Asked Questions — частыя запытанні). Вельмі дзіўна, але ў гэтай рубрыцы знаходзяцца не пытанні ад наведвальнікаў, а звычайнае газетнае інтэрв'ю. Думаецца, з часам „вялікакняжычы" выправяць пазначаныя недахопы.

Добра насычана інфармацыяй старонка „Музыка", дзе падаюцца цікавыя па змесце тэксты не толькі аб старажытнай музыцы ў апрацоўцы цяперашніх яе аматараў, але і распавядаецца аб сучасных музычных накірунках.

Рубрыка „Літаратура" з'яўляецца месцам прэзентацый кніг на розныя тэмы, з большага гістарычныя. Падаецца выгляд кнігі і тэкст да яе таго ці іншага крытыка. Дарэчы, прадстаўлена там і адна з апошніх Міхася Андрасюка.

„Публіцыстыка" прадстаўляе цэлыя артыкулы, кароткія пачаткі якіх размешчаныя на першай старонцы сайта. Яны таксама аздоблены рознымі малюнкамі ці фотаздымкамі.

Па задумцы распрацоўшчыкаў „Вялікае княства" мусіць мець, акрамя беларускай, яшчэ польскую, рускую і англійскую версіі. Але выйсці на іх не дзейнічаюць. Будзем спадзявацца, што пакуль.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Ці пройдуць далей?

Мінулы тыдзень прынёс айчыннаму спорту маленькую радасць. Жаночая гандбольная зборная Беларусі паспяхова прайшла першы кваліфікацыйны этап да чэмпіянату свету, фінал якога пройдзе праз год у Францыі. Паспрыяў гэтаму ці не найперш фактар сваёй пляцоўкі — адборавыя гульні 2-й групы праходзілі ў Магілёве. Саперніцамі беларусак сталі дружыны Швейцарыі, Славаччыны, Літвы і Латвіі. З першымі дзвюма ў нашай нацыянальнай дружыны адмоўны баланс сустрэч. Дадам, што славачкі двойчы пераходзілі беларускай камандзе дарогу на шляху да топ-турніраў. І вось нашым гандбалісткам пад кіраўніцтвам алімпійскага чэмпіёна, трэнера Канстанціна Шараварава ўдалося ўзяць рэванш.

За суверэнны час гандбалісткі зборнай Беларусі некалькі разоў выступалі ў фінальных стадыях турніраў вышэйшага рангу. У 1997 г. у Нямеччыне і ў 1999 г. у Аўстрыі на чэмпіянатах свету беларускі пад кіраўніцтвам Леаніда Гуско (гэты трэнер, на жаль, вельмі рана пайшоў з жыцця) даходзілі да адной восьмай фіналу, дзе саступалі гаспадыням пляцоўкі (што цікава, тыя пасля сваім парадкам станавіліся бронзавымі прызёркамі). А ў фінале першынства Еўропы нашы дзяўчаты ўпершыню бралі ўдзел у 2000 г., дзе занялі 11-е месца з 12. У 2002 г. ужо пад кіраўніцтвам Валерыя Пяўніцкага беларуская зборная была класіфікавана апошняй — 16-й. Такога ж выніку дасягнуў на еўрачэмпіянаце 2004 г. і Канстанцін Шараваў. Пасля гэтага нацыянальная каманда Беларусі „вывалілася" з абоймы мацнейшых дружын свету і Еўропы. За два мінулыя цыклы без фіналаў склад каманды істотна абнавіўся. З ветэранаў засталася толькі шматгадовая лідэрка Раіса Ціхановіч, але на гэты турнір прыехаць з Нямеччыны яна не здолела.

Касцяк каманды складаюць зараз гандбалісткі, якія выступаюць у двух беларускіх клубах — сталічным БНТУ і „Гараднічанцы", а таксама ў сумежных дзяржавах — Польшчы, Расіі, Украіне. У больш аддаленай краіне выступае толькі распасоўшчыца Алеся Курчанкова — у іспанскім „Алікантэ".

Для пачатку беларускі перамаглі зборную Швейцарыі (27:21) і відавочнага аўтсайдара — каманду Латвіі (40:12). Ключавым станавіўся трэці паядынак са славачкамі. Цягам сустрэчы беларускі ўвесь час ішлі наперадзе, нягледзячы на адчайны супраціў саперніц. Невялікую перавагу ўдалося ўтрымаць да самай фінальнай сірэны (31:29). Але гэта была, як выявілася пазней, толькі палова справы. У апошнім матчы з літоўкамі нашых задавальняла нават нічыя. І ў першым тайме беларускі выразна дамінавалі. Аднак пасля антракту здарылася метамарфоза. У сярэдзіне другога тайма нашу каманду нібы „заклінавала". А вось паўночныя суседкі прыкметна ажывіліся і ўрэшце параўнялі лік — 21:21. Літоўская дружына пасля дзесяці год застою зараз выразна прагрэсуе. Балазе яшчэ што добра ў крытычныя хвіліны згуляла другая галкіпер зборнай Беларусі мінчанка Алена Абрамовіч. Добрых слоў заслужыла і лепшая бамбардырка Наталля Майлычка. Урэшце ўсё скончылася як належала — 27:24. Акрамя названых гандбалістак у розных матчах сябе выявілі гарадзенка Вольга Кандрацьева, галкіпер Алеся Сафонава, Валянціна Грыгор'ева (абедзве выступаюць у Расіі), Ірына Арцёменка (гуляе ў Польшчы). У цэлым жа каманда толькі на шляху фармавання. І выйсці ў фінальную частку праз так званы накаўт-раўнд будзе вельмі няпроста.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Іронія, горыч, беларускі лёс

Калегія Усходняй Еўропы з Вроцлава выдала ў апошні час дзве чарговыя кніжкі з серыі „Беларуская бібліятэка". На польскую мову былі перакладзены *Kochanek jej wysokości Уладзімера Арлова і *Święta Nowego Rocku** Андрэя Хадановіча.**

Дзякуючы гэтай серыі на выдавецкім рынку з'явіліся ўжо тры пазіцыі. Першай была *Gdy witają się dusze* Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна. Уладзімер Арлоў, як сам напісаў, нарадзіўся ў год смерці Сталіна — у Полацку. Кнігу „Каханак..." складаюць чатыры часткі — кожная па пятнаццаць аповесцей. Падобна як і ў іншых кніжках гэтага аўтара, гістарычная, мабыць, схільнасць пераплятаецца з гумарам і час ад часу з горкай іроніяй. Першае з апавяданняў пачынаецца ў перакладзе вось так: *„Niepodległość to gdy przyjdziesz na świat w klinice położniczej, w której nie ma najsterylniejszych na świecie sowieckich karaluchów, a są igły jednorazowe i pieluszki"*. Пераклалі тэксты Ян Максімюк, Галіна Максімюк і Канстанцін Бандарук. Ва ўступе Ян Максімюк піша: „Жарснасць і жар палеміста, што з'яўляецца поўнасцю зразумелым, без цяжкасцей адчытваем у апавяданнях аўтара, прысвячаных гістарычнай тэматыцы. Пошукі Беларусі і яе тоеснасці безупынна прысутныя ў кантэксце ці падтэксце ягоных расказаў аб сялянскіх бунтах з першай паловы XVIII ст. (Ласка князя Гераніма), аб пасцельных забаўках расійскай царыцы Кацярыны (*Каханак яе вялікасці*) ці аб студзеньскіх паўстанцах, абложаных расійскім войскам (*Пяць мужчын у леснічоўцы*)". У апавяданні *Краявід з ментолавым пахам*, які завяршае зборнік, Арлоў дзеліцца развагамі ў сапраўды меланхалічна-беларускім настроі: *„Być może was też kiedyś nawiedzało przerażające poczucie, że zachowanie windy, którą akurat jedziecie, wychodzi poza ramy dozwolone instrukcją, że mechanizm zbyt szybko nabiera rozpędu, grożąc nie tylko tym, że nie wypuści was na ostatnim piętrze, a że zawiezie was znacznie wyżej od ostatniego piętra"*. У сваю чаргу ў загаловачным апавяданні царыца дзеліцца са сваім каханкам мудрасцю: *„Pamięć, Liciwinie, zawodzi, a historia zawsze kłamie. Wiesz, że jest mnóstwo określeń nauki Klio. Dla mnie najbardziej pasuje określenie: ksiega, którą piszą zwycięzcy"*. Ён адказвае: *„Historię jeszcze nazywają wcieleniem czasu. Ona umie się przeciwstawiać. Może być bronią"*. Прачытаўшы гэтую кнігу, аж хочацца спытаць: што можа зрабіць сумленны, прыстойны беларускі гісторык? Заняцца, як Арлоў, прыгожым пісьменствам. У ягоным выпадку — як заўжды, на высокім літаратурным узроўні.

У сваю чаргу *Święta Nowego Rocku* Андрэя Хадановіча гэта паэтычны зборнік. Аўтар мог бы быць сынам Уладзімера Арлова. Нарадзіўся ў 1973 г. у Мінску. Займаецца таксама і перакладамі (м.інш. з польскай мовы; гэта ён напісаў папулярную таксама на Беласточчыне песню *Дзяўчына з Беластока, не будзь ка мне жастока*). Ва ўступным слове да *Свят...* ягоны калега, пісьменнік з Гданьска Павел Гюле заяўляе: „Чытач знойдзе ў гэтых творах заадно вельмі асабістую іронію і пачуццё гумару аўтара, насычаныя паэтычныя вобразы, што застаюцца ў памяці доўга пасля прачытання вершаў (напрыклад, *Эўрыдыка ў мінскім метро*), а таксама перафільтраваны літаратурнай уражлівасцю вобраз сучаснай Беларусі: дзівоснай мяшанкі інтэрнэтнага чата з калгасным святам у гонар спадара прэзідэнта". Вершы пераклалі м.інш. Лешак Энгелькінг, Ян Максімюк і Багдан Задура. Зборнік аздобілі малюнкі Андрэя Пакроўскага. Завяршае яго верш Уладзімера Арлова *Przyśnił mi się Chadanowicz*: *„Przyśnił mi się Chadanowicz: / Tak dostojny jak senator / Niedobity przez Nerona, / Ironiczny jak Swetoniusz, / Zatroskany tak jak Brutus. / Może kogoś zabił sam, / Może chciał ułożyć wierszyk, / Albo chciał po prostu / Wypić piwa naprzeciwko / Gmachu służby KGB, / Gdzie od dawna się ciekawią / Naszym słowem poetyckim / I na pewno w jakimś celu"*.

Раіна СТЭФАНЧУК

*Uładzimier Arłou, *Kochanek jej wysokości*. Andrej Chadanowicz, *Święta Nowego Rocku*. Seria „Biblioteka Białoruska". Kolegium Europy Wschodniej 2006.

Прыходзілася гараваць

Людзі са Збуча пачыналі карыстацца сельскагаспадарчай тэхнікай яшчэ пры царскай уладзе. Гаспадаранне на якасных землях дазваляла ім атрымаць прыбытак. Некаторыя гаспадары пасылалі сваіх дзетак на дадатковую адукацыю, якая давала магчымасць працаваць у горадзе. Самае вялікае гора спаткала жыхароў сяла ў пачатку XX стагоддзя. Большая частка збучан пад уздзеяннем тагачаснай прапаганды ў 1915 годзе ўцякла перад немцамі ў Расію. Некаторыя бежанцы не пражылі жахлівых умоў у час ваенных і рэвалюцыйных падзей і памерлі далёка ад роднай вёскі. Бежанцы пасля вяртання засталі зарослыя зеллем панадворкі і аблагі на палях. Многія наймаліся да работы. Пры санацыі цяжкай працай адбудоўвалі яны свае гаспадаркі. Неспрыяльным для сяла быў час савецкага і нямецкага ўладарання. Пасля вайны жыхарам Збуча прыйшлося адбудоўваць спаленую пры адыходзе немцаў частку вёскі. У пяцідзесятых гадах гаспадары не хацелі дабравольна аддаваць сваіх якасных палёў у калгас. Толькі з сямідзесятых гадоў паправілася жыццё ў вёсцы, але тады ўжо адыходзіла з жыцця бежанскае пакаленне.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аляксандр Максімюк

Бежанства спыніла развіццё вёскі

Перад бежанствам прыбытак з гаспадарання ў Збучы быў штораз большы. Людзі пачалі адкладаць грошы і купляць сельскагаспадарчыя машыны, некаторыя пачалі пасылаць дзяцей на дадатковую вучобу. Добрую адукацыю здабыў Юліян Юшкевіч, які выехаў на пастаяннае жыхарства ў горад.

— Брат майго бацькі, Юліян Юшкевіч, пасля вучобы працаваў начальнікам чыгуначнай станцыі ў Лохаве, дзе было Прадпрыемства вытворчасці сельскагаспадарчых машын. Прыслаў ён нашай сям'і сячкарню і вузкую малацілку. Іншыя жыхары нашай вёскі заказвалі ў дзядзькі Юліяна сельскагаспадарчыя машыны і ён па чыгунцы пастаўляў іх, — кажа Пётр Юшкевіч. — Багацейшыя жыхары Збуча нажылі нават золата. Аднак перад рэвалюцыяй нашы людзі сталі мяняць яго на папяровыя рублі, бо гаварылі, што золата можа сцірацца. Пасля рэвалюцыі царскія рублі страцілі вартасць і кіпы гэтых грошай доўга ляжалі ў некаторых нашых дамах.

Большасць жыхароў Збуча выехала ў Расію перад надыходам фронту, апасаючыся немцаў, якімі палохала тагачасная прапаганда. Пасяліліся яны ў Карапоткіне Тамбоўскай губерні.

— Наш Юліян выехаў у Маскву, там працаваў загадчыкам вялікага прадпрыемства і не вярнуўся ўжо ў родную вёску, — кажа яго пляменнік, спадар Пётр. — Частка жыхароў Збуча не падалася ў бежанства і пад іх наглядам сяло ўцалела.

Калі збучане вярнуліся дамоў, прыйшлося ім змагацца з голадам. Мужчыны і жанчыны наймаліся на працу ў жыхароў вёскі, якія не паехалі ў бежанства і хадзілі працаваць у суседнія сёлы, каб зарабіць на ўтрыманне. Некаторыя асобы выязджалі за работай у глыб Польшчы. Аблагі пачыналі зарастаць лесам. Трэба было многа працаваць, каб вярнуць зямлі ўраджайнасць.

Адбудова гаспадарак

— У міжваенны перыяд нашы людзі жылі бядней, чым пры царскім панаванні. Не ўсе сяляне пасылалі дзяцей у школу, — кажа Пётр Юшкевіч. — Пасля вяртання з бежанства ў нас было 18 гектараў поля, але пасля яно было падзеленае. У людзей, у якіх было менш зямлі, не хапала харчавання на прадвесні.

Калі жыхары Збуча нажылі ўжо жывёлу і купілі коней, гаспадаркі ізноў пачалі даваць прыбытак.

— Перад самой вайной сталі мы жыць лепш. Купілі манеж, малацілку і нават ровар, якім я даязджаў у школу ў Орлі. Пасля накіравалі мяне ў прафесійную школу, але ўспыхнула вайна і мая вучоба закончылася, — успамінае Аляксандр Максімюк.

Жыхары Збуча ўжо ў міжваенны перыяд цікавіліся гарадзішчам побач сяла. Высокія ўмацаванні і балота вакол іх рабілі гэтае месца таямнічым.

— Праз гарадзішча пралягалі палоскі поля. Найчасцей гаспадыні садзілі на ім агародніну, бо была там вельмі добрая зямля, а на ўмацаваннях расла трава, на якой пасвілі кароў і коней, — кажа Марыя Максімюк.

— Перад вайной умацаванні вакол гарадзішча былі вельмі высокімі і мы, пасвячы коней, апасаліся, каб не зляцець на поле, — гаворыць Аляксандр Максімюк. — Вакол гарадзішча было вельмі гразка. Здаралася, што страглі каровы, якіх трэба было выцягваць з дапамогай жэрдак. У трыццатых гадах з-пад гарадзішча выкапалі роў і зямля побач яго абсохла. Знайшлі там стары збанок і рог, якія цяпер напэўна даследавалі б.

Савецкае панаванне і нямецкую акупацыю людзі са Збуча ўспамінаюць адмоўна. Многа часу займалі ім прымусовыя работы ў лесе. Пры гэтым трэба было яшчэ здаваць харчпрадукты і дакладна выконваць указанні мясцовых улад.

— Пры савецкай уладзе накіравалі мяне на работу ў Чарлёнку і я там у галоўным працаваў у лесе. Калі немцы напалі на Савецкі Саюз, я быў якраз дома і таму астаўся ў жывых. Людзей, якія рабілі са мной у Чарлёнцы, вывезлі ў Савецкі Саюз і яны хіба там загінулі, — кажа спадар Максімюк.

Спалілі палову сяла

Для многіх сем'яў са Збуча трагічным быў канчатковы перыяд вайны.

— Калі немцы адступалі перад савецкімі войскамі, падпалілі вёску і падаліся ў напрамку Бельска. Мы да адыходу немцаў баяліся выходзіць з зямлянак і гасіць пажар. Немцы забілі аднаго мужчыну, які вылез са схованкі. Я хацеў падбегчы пад хлеў і выпусціць з яго кабылу, каб не згарэла, але бацькі не пусцілі мяне. Тлумачылі, што немцы могуць забіць мяне, — успамінае Пётр Юшкевіч. — Нямецкія загады выконвалі таксама ўласаўцы, апранутыя ў нямецкія мундзіры. Гэта яны падпальвалі многія будынкі ў нашай вёсцы.

Савецкія салдаты прыйшлі ў Збуч са Старога Беразова і стралялі па немцах, якія затрымаліся за Арлянкай.

— Калі мы вылезлі з зямлянак, палова нашага сяла была спалена. У нас згарэлі клуня і хлеў, а ў ім кабыла, свінні і куры. Хата асталася, бо была ўжо пакрытая чарапіцай. Вецер укінуў агонь у хату праз акно, але выгарэў толькі верх стала і ўсё згасла, — гаворыць спадар Юшкевіч.

— Нашы гаспадарчыя будынкі таксама згарэлі ў час пажару. Аднак мяне тады не было дома. Пасля прымусовай працы ў Германіі з 1941 па 1944 год я яшчэ трапіў у Савецкую Армію і служыў там вадзіцелем, — заяўляе Аляксандр Максімюк. — Наш бацька паспрабаваў гасіць гаспадарчыя будынкі, але прагналі яго. Хата была крытая чарапіцай і таму асталася.

Запіхвалі ў калгас

Пасля вайны жыхары Збуча танней куплялі драўніну на адбудову дамоў, хлявоў і клуняў. Аднак большай дапамогі ад народнай улады людзі не атрымалі. Наадварот, некаторыя сяляне, якія не справіліся з велізарнымі падаткамі, трапілі ў турму.

— Калі я вярнуўся з фронту, не было ў жывых майго бацькі Васіля. Забралі яго з Лазіцаў разам з іншымі вазакамі бандыты і забілі. Прапалі тады таксама конь і воз, — кажа спадар Максімюк. — Дома засталіся я з мамай і трыма сёстрамі. Першыя гады пасля вайны мы проста мучыліся. Не спраўляліся з вялікімі падаткамі і абавязковымі пастаўкамі прадуктаў харчавання і мяне за гэта пасадзілі ў турму на год часу.

Хаця пасляваенная ўлада моцна націскала на збучан і старалася нагаварыць уступіць у калгас, ахвотных было мала. Тыя, што ўступілі, пасля шкадавалі.

— Пасля вайны цяжка было гаспадарыць і тады проста сталі запіхваць людзей у калгас. Наша сям'я, у якой ад вялікай дзедавай гаспадаркі асталося толькі 6 гектараў, уступіла ў калгас у 1952 годзе і тады прыблізна ліквідавана была ў нас цераспалосіца, — успамінае Пётр Юшкевіч.

— Наша сям'я не запісалася ў калгас. Калі я служыў у Савецкай Арміі, салдаты расказвалі мне пра калектыўнае гаспадаранне ў Савецкім Саюзе і я ведаў чаго можна чакаць, — тлумачыць Аляксандр Максімюк. — Аднак калгаснікаў не саджалі ў турмы і яны пражылі на вольнасці.

Калгаснікі паспелі паставіць абору і будынак для збожжа.

— Пачалі яны нават супольна гадаваць кароў. Коней трымалі яшчэ ў прыватных хлявах і толькі выходзілі з імі на калгаснае поле. За супольную работу давалі нам збожжа, — успамінае спадар Юшкевіч. — Калі да ўлады прыйшоў Гамулка і дазволіў ліквідаваць калектыўныя гаспадаркі, наш калгас разляцеўся.

Аляксей МАРОЗ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Накład: 2 000 egz.

Суседскія былі

НЕДАРЭЧНАСЦІ СТАТЫСТЫКІ

У Гродзенскай вобласці, паводле папярэдніх даных перапісу 1999 года, налічвалася 1 166 958 чалавек. Скрупулёзныя аж да зубнога болю статысты гэтую на дзвычай сухую лічбу ўмудрыліся падзяліць яшчэ на дзве, якія таксама не выдзяляюцца сакавітасцю і паэтычнасцю: 545 032 — колькасць моцнай паловы жыхароў, і 621 926 — наканаваны Небам лёс той моцнай паловы. Але я з упэўненасцю, памножанай на квадрат, бяруся разбіць ушчэнт гэтае сцвярджэнне шэрых слугаў занудлівых лічбаў, якія ў свае, нібыта беспамылковыя разлікі вераць больш, чым католікі ў беспамылковасць рымскага папы.

Дарэчы, мае словы можа пацвердзіць Яўген Сініцкі. Тагачасны біч усіх студэнтаў-выпускнікоў, імя якога „размеркаванне", накіраваў Яўгена, адразу пасля заканчэння універсітэта, у Ашмянскі раён у якасці маладога спецыяліста шырокага профілю. Што азначае той шырокі профіль ні Сініцкі, ні хто іншы не ведаў. Хіба таму Яўгенаў начальнік надзяліў таго правамі перапісчыка і паслаў занатоўваць імёны жыхароў маленечкай вёсачкі Вялікія Равы.

Сініцкі паставіўся да першага прызначэння з поўнай адказнасцю. У дзень перапісу ён апрануўся як франт, ва ўсё новенькае, і накіраваўся аўтастопам да месца прызначэння. Але толькі саскочыў з грузавіка, як адразу патрапіў абодвума новенькімі сандалямі ў неверагодна вялікі, нібыта адмыслова для яго падстаўлены, каровін блін, заляпаўшы аж да дзяжкі свае белыя порткі. Хлопец менш балюча ўспрыняў бы гэтую недарэчнасць, каб не звонкі смех маладзенькай дзяўчыны, якая, як на зло, у гэты момант намагалася пераважаць тую карову.

— Дзе тут можна памыцца? — запытаў збянтэжаны юнак, і, глянуўшы ў вочы дзяўчыны, аслупянеў. Якія гэта былі вочы! У сталіцы такіх ужо даўно не знайсці. Вось толькі тут, на перыферыі, так бы мовіць, напрыканцы свету, у глухой, дрымучай правінцыі і можна нарвацца на нешта такое... Шчырае, чыстае... Шкада толькі, што нырацъ у тыя вочы сваім позіркам прыходзілася стоячы ў сярэдзіне каровінага круга.

— У нашай хаце. Больш у вёсцы ўжо ніхто не жыве, толькі мы, — перастала рагатаць дзяўчына, яўна зацікавіўшыся патаемным сэнсам позірку маладога хлопца.

А той, нясмела пакінуўшы свой аэрадром, паспяшаўся хутчэй схаваць свае смярдзючыя сандалі падалей ад насмешак юначкі. Праўда, паабяцаў сабе вярнуцца да пачатай размовы адразу як пераабуецца.

Яшчэ абмываючыся ля плыткай студні Вялікіх Равоў, Сініцкі, выконваючы абавязкі перапісчыка, разведаў у гаспадара як завуць яго дачку. Той быў добра пад шафэ, але змог адказаць на гэтае простае для кожнага бацькі пытанне. І роўна праз тры дні і дваццаць чатыры хвіліны, юны правобраз маладога спецыяліста, часова выконваючага абавязкі перапісчыка, у гумовых ботах і портках цёмнага колеру стаяў як штык ля ганка адзінай жылой хаты Вялікіх Равоў і патрабаваў паклікаць яму Валю. Адзінае, што адрознівала яго ад сапраўднага калгасніка, гэта купленыя ў раённым цэнтры кветкі, гваздзікі, якія на фоне вясковых геаргініяў і гладыёлусаў, што буялі тут паўсюдна, глядзеліся як падыхаючае з голаду кацянё на фоне сытых бліскучаскурых тыграў.

Гаспадар быў у дакладна такім стане як і мінулы раз і з цяжкасцю прастагнаў:

— Табе якую Валю?

— Як якую? — збянтэжыўся нядаўні студэнт-выдатнік, якому хіба ўпершыню задалі такое закручанае пытанне, на якое той не змог бы адказаць нават карыстаючыся шпаргалкамі. — Вядома ж якую! Дачку вашу.

— Ведаю, што дачку! Але якую? — пачаў нервавацца бацька тых глыбокіх выразных вачэй.

— Што значыць якую? — юнак пачаў лыпаць. — Я ж кажу, Валю.

— А-ах, — махнуў рукой гаспадар, нібыта канчаткова расчараваны інтэлектам прэтэндэнта ў будучыя зяці, і выгукнуў усёй моцай сваіх грудзей, — Валі, дочачкі, ідзіце сюды абедзве.

З хаты выйшлі дзве дзяўчыны. Адна, кінуўшы на Яўгена зняважлівы позірк, вярнулася назад. А другая, з тымі вачамі, падляцела да Яўгена, і, з ласкавай усмешкай, прывіталася.

Яўген працягнуў ёй кветкі (відовішча, ад якога яе бацька з агідай плюнуўшы адвярнуўся), і нясмела, ужо разумеючы, што не змог выканаць абавязкі перапісчыка нават у маленькай вёсцы, дзе людзі жывуць толькі ў адной хаце, спытаў:

— Вы родныя сёстры і абедзве Валі? А я пытаў у твайго бацькі, для анкеты, хто з ім яшчэ жыве. Ён два разы сказаў: „Дачка Валя". А я толькі раз запісаў. Думаў, ён п'яны так загаварваецца.

— Не, не загаварваецца — спакойна адказала дзяўчына, хіба што даўно прывычная да такіх пытанняў і адразу растлумачыла: — Як мая сястра нарадзілася, яе назвалі Валя. Пасля я нарадзілася праз тры гады. А бацька яшчэ першай дачкі не перастаў замочваць. Так і паслала мая маці яго, п'янога, зарэгістраваць мяне ў сельсавеце. А там кажуць: „Але ж і п'яны прыйшоў! Ці хоць памятаеш імя дачкі?". „Канечна, памятаю, — сцвярджае бацька. — Імя маёй дачкі — Валя". Вось так мяне Валяй і запісалі.

— А чаму ж не выправілі памылку пазней? — збянтэжана запытаў няўдалы перапісчык, які зараз зразумеў, што зблытаў усім статыстам лічбу жанчын у вобласці, і, адпаведна, агульную колькасць усяго насельніцтва.

— А не сталі мяняць імя таму, што бацька наступныя тры гады замочваў маё з'яўленне на белы свет. І мама баялася, што як пашле яго ў сельсавет, то ён здуру мяне возьме і назаве якім Іванам ці Арыстархам. Лепш, вырашыла, хай дзве Валі будуць.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Габрыеля Лаўба.

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54						

1. стужка, звязаная ў выглядзе вузла і дзвюх або некалькіх свабодна выпушчаных петляў = 18 _ 35 _ 44 _ 34 _;
2. напр. марафон = 11 _ 2 _ 1 _;
3. Лаўрэнцій, галоўны энкавэдыст = 46 _ 45 _ 9 _ 43 _ 47 _;
4. горад на Дняпры на поўдні Магілёўскай вобласці = 32 _ 29 _ 30 _ 31 _ 15 _;
5. муж польскай пані = 6 _ 39 _ 42 _;
6. штраф за невыкананне абавязацельстваў = 49 _ 50 _ 52 _ 14 _;
7. Аляксей, беларускі паэт (1920-81) = 21 _ 13 _ 33 _ 37 _ 16 _;
8. поласць між верхняй і ніжняй сківіцамі = 3 _ 4 _ 8 _;
9. высушаная трава = 48 _ 17 _ 38 _ 7 _;
10. брат дачкі = 20 _ 53 _ 12 _;
11. аб'яднанне дзяржаў або цэркваў = 25 _ 27 _ 26 _ 19 _;
12. краіна Багуміла Грабаля = 51 _ 10 _ 40 _ 5 _ 41 _;
13. краіна Аўгуста Стрындберга = 28 _ 36 _ 22 _ 23 _ 24 _ 54 _.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 44 нумара

Вось, Ілі, Іпуць, кіт, лыжы, Ош, Тот, Штырыя, Юг.

Рашэнне: **Гісторыю пішуць толькі тыя, што выжылі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбал.

10.12 – 16.12

Баран (21.03. — 19.04.) Да 13.12. твае дзеянні найбольш паспяховыя. Кожнага пераканаеш да сваёй рацыі. Пасля прабудзяцца ў табе такія здольнасці, якіх ты па сабе не спадзяваўся. Выкараскаешся нават з безнадзейнай сітуацыі.

Бык (20.04. — 20.05.) Будзеш прымушаны чагосьці пазбыцца або з кімсьці расстацца, на чым ці на кім табе вельмі залежыць. Неблагі, усё ж, настрой. Можа выявіцца нейкая таямніца.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Можа ашарашыць цябе нейкая нямілая сітуацыя. Будзь цвярозы і паводзь сябе так, як табе падкажа інтуіцыя. Крытыку старайся прымаць спакойна. Можаш страціць вельмі блізкую табе асобу.

Рак (22.06. — 22.07.) Благі настрой, раздражненасць, ахвота займацца непатрэбным. Можаш змяніць адносіны з нейкай асобай; калі ты заняты, можа атрымацца немалы „паштэт". Чорная сямейная авечка зноў можа „вывінуць казла".

Леў (23.07. — 22.08.) Справішся з эмоцыямі, якія цябе ў апошні час раскалацілі. Ліпнёвыя Львы хай паслухаюць вопытных людзей. Можаш зноў перажываць старыя справы. Цёпла апранайся.

Дзева (23.08. — 22.09.) Можа цябе вывесці з раўнавагі абы-якая драбяза. Трымай эмоцыі на ланцугу! Забудзь пра нямілыя справы, тым больш, што цяпер можаш спакойна паадпачываць.

Шалі (23.09. — 22.10.) Будзе дакучаць табе пачуццё сваёй непаўнацэннасці, незадаволенасці з жыцця, недахопу карысці з працы. Ахвота ўсё кінуць і пачаць новае жыццё. Старайся не сядзець на адным месцы.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Будзеш старацца падзарабіць, магчымасці будуць. Нестабільныя дні ў пачуццях, ахвота паводзіць сябе экстравагантна. За блізкіх ты гатовы кінуцца ў агонь. Ды шэф папракне цябе ў рассеянасці і неадказнасці.

Стралец (22.11. — 21.12.) Канец з пачуццёвымі развагамі; каханая асоба дасць табе цяпло, уражлівасць, далікатнасць. Ахвота падзейнічаць. Твая сварлівасць дакучае хатнім!

Казярог (22.12. — 19.01.) А чаму ж ты цяпер такі скупы? Блізкія табе гэтага не даруюць! І тая рэфлексіўнасць, замкнёнасць? І меланхоліі нейкія цябе сталі турбаваць! А Венера ўсё нясе табе каханне!

Вадалей (20.01. — 18.02.) Можаш пасварыцца з сябрамі. Не старайся папраўляць людзей сілай, калі яны гэтага не хочуць! Неахвота гуляць, больш волі пасядзець з адной-двума асобамі. А ўсе табе цяпер спрыяюць.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Столькі фізічнай энергіі ў табе бушуе! Адвага, аптымізм, правадырскія ўмеласці, спрыт, інтэлігентнасць — можаш спадзявацца на павышэнне. А каханая асоба дасць табе пачуццё бяспекі. Ды пазваночнік крыху паскрыпіць...

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960